ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 12 (1035) 24 сакавіка 2012 г. Кошт 2500 рублёў.

“ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ”
ДУРЗАЦ ПРЭМІЯ

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

СТРАСЦІ ПА... ТЭАТРЫ!

27 сакавіка прыхільнікі і стваральнікі тэатральнага мастацтва нашай краіны святкуюць Міжнародны дзень тэатра.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

С. 3, 6 — 8

ШАНЬ-ШУЙ І «КВЕТКІ-ПТУШКІ»

С. 9

ЭСТРАДНЫ ТАНЕЦ: А ЦІ ЁСЦЬ ТАКІ?

С. 10

ПРЭМ'ЕРА ДЛЯ ТЭЛЕ...

С. 8

КРАПІВА ЗАМКА ГАЛЬШАНСКАГА

С. 4 — 5

НЕЗАПАТРАБАВАНАЯ «КАРТКА ГОСЦЯ»?

С. 11

Конкурсы на конкурсы "Славянскага базару..."

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прымае заяўкі на ўдзел у Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" і ў Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе "Віцебск", што пройдуць у час XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Як паведамілі "К" у Міністэрстве культуры, у адборачным туры да конкурсу выканаўцаў прымаюць удзел артысты ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў уключна. Гэта тыя, хто мае вопыт канцэртных выступленняў, хто заявіў пра сябе поспехамі на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах ды фестывалях. У адборы да дзіцячага "Віцебска" могуць удзельнічаць выканаўцы ад 7 да 12 гадоў. Яны таксама павінны мець вопыт канцэртных выступленняў. Узрост удзельнікаў вызначаецца па стане на 1 чэрвеня бягучага года.

Адборачныя туры ладзяцца ў два этапы. Пад час першага экспертная група да 10 красавіка адсочвае аўдыя- і відэаматэрыялы. У выніку адбіраецца па дзесяць чалавек да кожнага конкурсу. Цягам другога этапа прафесійнае журы праслухоўвае выканаўцаў, што прайшлі першы і выступяць у суправаджэнні фанаграмы "мінус адзін" (да 20 красавіка) на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады. Па выніках другога этапа адбіраецца адзін дарослы выканаўца і двое дзяцей, якія і прадставяць на віцебскім форуме Беларусь.

> Да 1 красавіка можна даслаць бандэроль з заяўкай на ўдзел у міжнародных конкурсах "Славянскага базару ў Віцебску".

Для ўдзелу ў адборачных турах трэба падрыхтаваць: для першага этапа — відэазапіс дзвюх песень (на выбар) працягласцю не больш за чатыры хвіліны; для другога — дзве песні працягласцю не больш за чатыры хвіліны, якія выконваюцца ў суправаджэнні фанаграмы "мінус адзін" (эстрадная песня беларускага аўтара на беларускай мове — для ўдзельнікаў абодвух конкурсаў; эстрадная песня кампазітараў славянскай краіны на адной са славянскіх моў — для дарослых; эстрадная песня, што найбольш ярка адлюстроўвае выканальніцкае майстэрства і артыстычныя здольнасці канкурсанта, — для дзяцей).

Заяўка накіроўваецца каштоўнай бандэроллю на адрас: 220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11, Міністэрства культуры, з пазнакай у залежнасці ад узросту ўдзельнікаў: "Адборачны тур конкурсу "Віцебск" (дарослыя)" або "Адборачны тур конкурсу "Віцебск" (дзеці)". Апошні дзень прыёму бандэроляў — 1 красавіка.

Вынікі першага этапа адборачных тураў падводзяцца экспертнай групай; другога — прафесійным журы. Склад экспертнай групы і прафесійнага журы фарміруецца з вядучых спецыялістаў у галіне музычнага эстраднага мастацтва, вядомых дзеячаў культуры і мастацтваў і зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

Як пройдуць юбілеі класікаў?

Днямі ў Міністэрстве культуры адбылося рабочае пасяджэнне аргкамітэта па святкаванні 130-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, а таксама 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады Стаўбцоўскага, Маладзечанскага і Мядзельскага раёнаў, а таксама ўпраўлення культуры Мінаблвыканкама.

У цэнтры сустрэчы было вызначэнне дат і месцаў правядзення асноўных урачыстасцей. Акрамя таго, па словах намесніка міністра культуры Тадэуша Стружэцкага, у працэсе падрыхтоўкі святаў надзвычай важна добраўпарадкаваць тэрыторыю, дзе адбудуцца сёлета літаратурныя мерапрыемствы, а таксама будынкі музейных аб'ектаў, калі гэтага вымагае іх стан.

Як адзначыў намеснік міністра, чакаецца выдзяленне сродкаў з рэспубліканскага бюджэту, а таму задача ўсіх арганізатараў — зрабіць свята не фармальным. Для забеспячэння гэтага ў бліжэйшай перспектыве пасяджэнні аргкамітэта плануецца зрабіць выязнымі і праводзіць іх у месцах будучых святкаванняў.

Акрамя таго, пад час працоўнага пасяджэння аргкамітэта былі абмеркаваны прыкладныя планы святочных мерапрыемстваў. Так, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч паведаміла, што сярод мерапрыемстваў у Вязынцы, якія запланаваны на 7 — 8 ліпеня, — выступленне акцёраў Купалаўскага тэатра з фрагментам пастаноўкі "Паўлінкі", канцэрт эстрадных выканаўцаў з песнямі на вершы класіка, выстаўкі і майстар-класы. Варта зазначыць, канцэртная пляцоўка ў Вязынцы будзе разлічана прыкладна на тысячу месцаў.

Тадэуш Стружэцкі падкрэсліў, што літаратура не павінна стаць "дадаткам" на свяце, а таму трэба паставіць канкрэтную задачу пра гэта перад рэжысёрамі ўрачыстых мерапрыемстваў.

Ужо ў кастрычніку распачнуцца святочныя мерапрыемствы на Стаўбцоўшчыне — малой радзіме Якуба Коласа. Па словах дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея паэта Зінаіды Камароўскай, на свята плануецца запрасіць мастацкія калектывы з некалькіх раёнаў. У прыватнасці, госці святкавання змогуць наведаць Акіньчыцы, Альбуць, Смольню, а таксама Мікалаеўшчыну, якая прыме выступленне сучасных пісьменнікаў.

> Пад час святкавання стагоддзя з дня нараджэння Максіма Танка вуліцы Мядзела ўпрыгожаць цытаты з вершаў класіка.

Асобная ўвага намесніка міністра культуры была звернута на падрыхтоўку экспазіцыі, прысвечанай жыццёваму і творчаму шляху Максіма Танка, сіламі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, і яе размяшчэнне ў Мядзеле, паколькі менавіта там 15 — 16 верасня пройдуць асноўныя ўрачыстасці з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння паэта. Акрамя таго, у гарадской бібліятэцы маюць экспанавацца работы ўдзельнікаў міжнароднага фотапленэру, правядзенне якога запланавана на чэрвень. Сярод "разыначак" літаратурнага свята можна адзначыць ідэю аздаблення вуліц Мядзела цытатамі з вершаў паэта, а таксама — стварэння адмысловай сувенірнай прадукцыі.

Надзвычай важным пытаннем, што мусіць быць вырашана ў бліжэйшы час, стане наданне статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці дому Максіма Танка ў вёсцы Пількаўшчына і яго добраўпарадкаванне.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Чатыры колы і новы партал Нясвіжа

Сёння поўным ходам ідуць работы па завяршэнні рэстаўрацыі і рэканструкцыі Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу. У першую чаргу ўвага спецыялістаў звернута на аднаўленне інтэр'ераў колішняй рэзідэнцыі Радзівілаў. Разам з тым, вядзецца праца па стварэнні годнай турыстычнай інфраструктуры.

Як паведамілі "К" у Нясвіжскім палацава-паркавым комплексе, 1 красавіка распачне працу новы сайт установы, які зможа дапамагчы сарыентавацца ў залах палаца не толькі шматлікім айчынным, але і замежным турыстам. Сярод ноу-хау партала — магчымасць выбару найбольш зручнага часу для наведання ўстановы і бясплатнага браніравання білетаў. Мяркуецца, што такім чынам яе супрацоўнікі будуць загадзя ведаць, якую колькасць турыстаў чакаць у той або іншы дзень.

Акрамя таго, у першы дзень красавіка перад уваходам у музейны комплекс адкрыецца Інфармацыйна-касавы цэнтр, дзе можна будзе набыць разнастайныя турыстычныя даведнікі, выданні, прысвечаныя гісторыі палаца, а таксама адзіны білет, што дазволіць наведаць як уласна сам палац, так і парк каля яго. Супрацоўнікі ўстановы лічаць, што стварэнне такога Цэнтра дазволіць размяркоўваць плыні турыстаў. У прыватнасці, плануецца сфарміраваць чатыры колы экскурсій, якія не перасякаліся б між сабой і стваралі максімальна камфортныя ўмовы як для турыстаў, так і для экскурсаводаў.

> 1 красавіка плануецца запусціць новы сайт Палацава-паркавага ансамбля і адкрыць Інфармацыйна-касавы цэнтр.

Мяркуецца, што першыя некалькі месяцаў праца па размеркаванні плыняў турыстаў мае ажыццяўляцца ў тэставым рэжыме, пасля чаго будзе прынята рашэнне пра пастаяннае выкарыстанне падобнай практыкі.

К.А.

Вяснісіма-філарманісіма

30 сакавіка Беларуская дзяржаўная філармонія распачне штогадовы цыкл канцэртаў "Мінская вясна".

Ён працягнецца сёлета да 18 красавіка, калі ва ўсім свеце будуць адзначаць 300-годдзе фартэпіяна, і ўключыць у сябе не толькі амаль два дзясяткі адметных вечарын, у тым ліку з удзелам сусветных зорак, але і, паводле традыцыі, Міжнародныя дні мандалінна-гітарнай музыкі "Мандалінісіма", якія пройдуць 5 — 7 красавіка.

Пра кожны з канцэртаў можна распавядаць асобна, бо яны таго вартыя. У адкрыцці фестывалю з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Беларусі на чале з народным артыстам краіны Аляксандрам Анісімавым саліраваць будуць сусветна знакамітыя скрыпачка Юлія Ігоніна (між іншым, выхаванка нашай нацыянальнай школы!) і віяланчэліст Марк Драбінскі — вучань Мсціслава Растраповіча. На канцэрце з удзелам аркестра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі дырыжыраваць будзе эстонец Эркі Пекх. Піяністы будуць горача вітаць масквіча Сяргея Кузняцова, санкт-пецярбуржцаў Дзмітрыя Зубава і Сямёна Дзянісава. Канцэпцыйны канцэрт "Часы… "Beatles" Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі ўпрыгожаць піяніст і дырыжор, мастацкі кіраўнік Стамбульскага дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Эрол Эрдзінч ды маскоўскі габаіст Дзяніс Освер. Гасцей з Масквы збярэ і "Мандалінісіма".

> 19 красавіка — у працяг штогадовай "Мінскай вясны" — чакаецца прэм'ера новай версіі "Песні пра долю" Уладзіміра Мулявіна.

Але справа не толькі ў зорных гастралёрах! Кожны беларускі ўдзельнік падрыхтаваў да "…Вясны" папраўдзе ўнікальную праграму. Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Беларусі пад кіраўніцтвам народнай артысткі краіны Людмілы Яфімавай адзначыць 120-годдзе з дня нараджэння заснавальніка калектыву, імя якога яна носіць, — Рыгора Раманавіча Шырмы. Аркестр народных інструментаў імя Л.Іванова Магілёўскай абласной філармоніі выступіць разам са знанымі опернымі спевакамі. Адметную праграму падрыхтавала для слухачоў сталіцы арганістка полацкага Сафійскага сабора, лаўрэат міжнародных конкурсаў Ксенія Пагарэлая.

Толькі не думайце, што з завяршэннем згаданага цыкла канцэртаў "вясна на Музычнай вуліцы" скончыцца. Наадварот: пачне буяць яшчэ ярчэй! Ужо 19 красавіка адбудзецца прэм'ера новай версіі "Песні пра долю" Уладзіміра Мулявіна, падрыхтаванай Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам Беларусі імя І.Жыновіча на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам Казінцом. А следам пачнецца і II Міжнародны фестываль "Уладзімір Співакоў запрашае".

Н.Б.

Малдаўскі акцэнт

Сёлета беларускія суполкі Малдовы плануюць правесці шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У прыватнасці, на Каардынацыйным савеце нашых суайчыннікаў у Малдове, што днямі прайшоў у горадзе Бельцы, было прынята рашэнне пра актыўны ўдзел беларускіх суполак Малдовы, якія дзейнічаюць у розных гарадах краіны, у правядзенні літаратурна-музычных вечароў, дыспутаў, "круглых сталоў", тэматычных кніжных выставак ды іншых мерапрыемстваў, прысвечаных творчасці беларускіх Песняроў.

Да таго ж, нашы суайчыннікі ў Малдове плануюць адзначыць юбілейныя даты Максіма Танка, Алеся Адамовіча, Рыгора Шырмы, Браніслава Тарашкевіча, Марка Шагала, а таксама Вітольда Бялыніцкага-Бірулі і Міхаіла Савіцкага. Беларускія абшчыны Малдовы запланавалі правесці прэзентацыйныя ды іншыя мерапрыемствы, скіраваныя на папулярызацыю беларускай кнігі, падтрымліваць мерапрыемствы па арганізацыі нацыянальных экспазіцый "Кнігі Беларусі" на міжнародных і нацыянальных выстаўках.

Акрамя таго, з боку беларусаў Малдовы плануецца садзейнічаць у развіцці супрацоўніцтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі з Нацыянальным мастацкім музеем Малдовы. У прыватнасці, бліжэйшым часам будзе распрацавана магчымасць арганізацыі выставак беларускіх мастакоў у галерэях Малдовы, падтрымка айчынных творцаў пад час экспанавання іх работ у мастацкіх галерэях краіны.

Банк спадчыны

На чарговай сесіі Віцебскага гарсавета дэпутаты зацвердзілі праграму захавання гісторыка-культурнай спадчыны горада на 2012 — 2015 гады.

Праграма, у прыватнасці, прадугледжвае стварэнне банка даных па гісторыка-культурных каштоўнасцях абласнога цэнтра. Галоўная яе мэта — забеспячэнне максімальнай ступені аховы каштоўнасцей, што ўваходзяць у Дзяржаўны спіс. Для гэтага вызначаны аб'екты, дзе патрабуюцца рамонтныя і рэстаўрацыйныя работы. Запланавана першасная кансервацыя помнікаў дойлідства, якім пагражае разбурэнне.

> У хуткім часе на Віцебшчыне падрыхтуюць абласную Праграму захавання гісторыка-культурнай спадчыны.

Начальнік аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама Наталля Шыянок, паведамляючы аб стварэнні банка даных, згадала, што ў Віцебску статус гісторыка-культурнай каштоўнасці маюць сёння каля 240 аб'ектаў. Некаторыя з іх — у аварыйным стане. Ахоўныя дошкі ёсць толькі на 180. Прынятая дэпутатамі праграма мае паскорыць рашэнне наспелых праблем.

Наш карэспандэнт запытаўся ў выконваючай абавязкі начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Ларысы Аленскай, ці існуе такая ж праграма для усёй вобласці. Паводле яе слоў, праграмы захавання спадчыны распрацоўваюцца па ўсіх гарадах ды раёнах і збольшага ўжо зацверджаны. Неўзабаве яны будуць абагульнены і сістэматызаваны ў праграме абласной. А рэалізацыя апошняй надасць, сярод іншага, турыстычную прывабнасць не толькі абласному цэнтру, але і Полацку, Оршы ды іншым гарадам і паселішчам.

П.В.

"Арт-лінія" — мовай графікі...

Дырэктар выставачнага комплексу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Фёдар Ястраб паведамляе "К", што 28 сакавіка ў галерэі "Ракурс" НББ адбудзецца вернісаж V Мінскай міжнароднай выстаўкі графікі "Арт-лінія".

У чарговы раз праект "Арт-лінія" пацвярджае статус адной з найбольш прадстаўнічых беларускіх выставак графікі. Сёлета ён збірае пад сваім крылом творы мастакоў з больш чым дзесяці краін СНД і свету: Беларусі, Расіі, Украіны, Таджыкістана, Кыргызстана, Казахстана, Польшчы, Бельгіі ды іншых.

Адзін са складнікаў пятай па ліку "Арт-лініі" — выстаўка работ прадстаўнікоў Творчых майстэрняў "Сенеж" (Расія), якія доўгі час узначальваў народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, член Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Расійскай акадэміі мастацтваў Георгій Паплаўскі. У Доме творчасці "Сенеж", дзе калісьці пісаў свае палотны І.Левітан, стажыраваліся прафесійныя мастакі з усяго былога Савецкага Саюза… Увазе публікі прадстаўляюцца творы ўдзельнікаў Майстэрняў 70-х гадоў — гравюры з сямейнай калекцыі Леаніда і Ніны Марчанкаў.

Па традыцыі, у рамках праекта будзе дэманстравацца рэтра-праграма, якая ўключае работы еўрапейскіх класікаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Сёлета яна прадставіць калекцыю эстампаў бельгійскага мастака-сімваліста Фелісьена Ропса. "Арт-лінія" мае на мэце пазнаёміць гледача з невядомым бокам творчасці майстра: прэзентуюцца партрэты, этнаграфічныя выявы ды іншае.

Побач з творамі сталых і прызнаных майстроў плануецца размясціць экспазіцыі работ маладых графікаў — студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Выстаўка "Арт-лінія", па перакананні Фёдара Ястраба, павінна раскрыць новыя перспектывы графікі, яе вялікі патэнцыял, здольнасць пастаянна абнаўляцца, адкрываць магчымасці для пошуку і эксперыментаў, акрэсліць сённяшні стан гэтага віду мастацтва, яго месца ў творчасці сучасных мастакоў Еўропы, садзейнічаць усталяванню далейшых творчых кантактаў.

Я.Р.

Тыдзень маладзёжнага “тэатрастаяння”

27 сакавіка — Міжнародны дзень тэатра

Чым цікавы "М.@rt.кантакт" моладзі? Якое месца фестываль займае ў тэатральнай прасторы Беларусі? Пытанні гэтыя неаднойчы ўзнімаюцца цягам сёлетняга, сёмага па ліку, форуму, які завершыцца акурат у Міжнародны дзень тэатра — 27 сакавіка.

“Нягледзячы на тое, што на сённяшні дзень у нашай краіне рэгулярна праводзяцца цэлых восем тэатральных фестываляў, “М.@rt.кантакт” у іх коле — з’ява заўважная і важная для айчыннага мастацтва, — падкрэсліў, наведаўшы форум у рамках рабочага візіту на Магілёўшчыну міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка. — Найперш таму, што цягам гэтага тыдня мы на ўласныя вочы бачым, як сучасныя маладыя людзі зацікаўлена працуюць у справе развіцця айчыннага тэатральнага мастацтва, яго рэальнай папулярызацыі не толькі сярод даўніх прыхільнікаў дадзенага віду творчасці, але і ў колах сучасных пятнаццаці-, дваццаці-, дваццаціпяцігадовых грамадзян.

І вось ужо другі год запар Міністэрства культуры аказвае фінансавую дапамогу фестывалю, прычым канкрэтна сарыентаваную: па падтрымцы пастановак маладых беларускіх рэжысёраў па творах маладых беларускіх аўтараў. Менавіта дзякуючы ёй у сёлетняй праграме форуму мы зможам пабачыць спектакль “Гаспадар кавярні”, бадай, самага вядомага і моднага на сённяшні дзень сучаснага беларускага рэжысёра Паўла Пражко ў рэжысуры Кацярыны Аверкавай.

Так сустракалі гасцей магілёўскага фестывалю.

Не раскрываючы загадзя ўсіх сакрэтаў форуму, першыя ж спектаклі якога традыцыйна сабралі аншлагі ў зале тэатра, хочацца зазначыць толькі адно: “М.@rt.кантакт” абяцае шэраг цікавых і знакавых сустрэч з сучаснай маладзёжнай творчасцю і самімі аўтарамі. Невыпадкова старшыня журы, народны артыст Беларусі Віктар Манаеў сказаў: “Большасць тэатральных фестываляў для акцёраў заключаецца ў тым, што мы прыязджаем, адыгрываем свой спектакль і... адпраўляемся дадому, часта так і не здолеўшы пабачыць, чым жа жывуць нашы калегі-артысты з іншых тэатраў… “М.@rt.кантакт” жа дае ўнікальную магчымасць сутыкнуцца з тым рэальным станам маладзёжнай творчай думкі, убачыць, што ў прафесіі насамрэч хвалюе нашых “пераемнікаў”.

Таццяна КОМАНАВА,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Магілёў — Мінск

Пра вынікі і тэндэнцыі фестывалю — у бліжэйшых нумарах "К".

Сяброўства часовым не бывае

Як паведамілі “К” у Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, 21 сакавіка па ініцыятыве Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Дзяржавы Катар у Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь Ахмеда С.Аль-Мідадзі адбылася сустрэча з ім міністра культуры нашай краіны Паўлам Латушкам.

Цягам перамоў абмяркоўваліся пытанні беларуска-катарскага культурнага супрацоўніцтва. Яго пачатак быў закладзены ў мінулым годзе — пад час жнівеньскага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Дзяржаву Катар. Менавіта тады была дасягнута дамоўленасць аб арганізацыі Дзён культуры Беларусі ў Катары. Прайшлі яны, як вядома, 7 — 9 сакавіка 2012-га.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка падзякаваў катарскаму боку за падтрымку нашай творчай акцыі. Сяброўства часовым не бывае, таму на сустрэчы абмяркоўвалася магчымасць наладжвання Дзён культуры Катара ў Беларусі. Мяркуецца, што яны адбудуцца ў маі з удзелам міністра культуры і гістарычнай спадчыны Катара Хамада бен Абд аль-Азіз аль-Кувары. Плануецца падпісанне праграмы культурнага супрацоўніцтва паміж урадамі абедзвюх краін.

Мяркуецца, што ў маі адбудуцца Дні культуры Катара ў Беларусі.

Сустрэча яшчэ раз пацвердзіла: бакі зацікаўлены ў далейшым умацаванні сяброўства, у яго рознабаковым культурным развіцці.

Наш кар.

У галерэі і пад вокладкай

29 сакавіка ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў адкрыецца традыцыйная, шостая па ліку, Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Няфёдаўскія чытанні. Беларускае мастацтва: традыцыі і сучаснасць”.

“Прысвечаныя памяці выдатнага айчыннага мастацтвазнаўцы і даследчыка тэатра Уладзіміра Няфёда, гэтыя чытанні сталі для айчынных навукоўцаў у галіне мастацтва адным з важных складнікаў іх прафесійнага жыцця, — адзначае доктар мастацтвазнаўства, прафесар Рычард Смольскі. — Найперш таму, што тут, у коле сваіх зацікаўленых калег, мы можам дзяліцца сваімі найноўшымі даследаваннямі і адкрыццямі, распавядаць пра тое, што адбываецца ў сучаснай мастацтвазнаўчай навуцы”.

Вось ужо другі год запар Чытанні праходзяць пад патранатам (у тым ліку і фінансавым) Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Да таго ж, відавочная цікавасць да навукова-даследчай дзейнасці з боку маладых людзей — студэнтаў і аспірантаў — дае падставы спадзявацца на тое, што новыя кадры трывала ўвальюцца ў колы айчынных навукоўцаў і надоўга затрымаюцца на гэтым полі дзейнасці.

“Няфёдаўскія чытанні” распачнуцца традыцыйным пленарным пасяджэннем у галерэі БДАМ. Далей — зацікаўленая навуковая работа па секцыях. А па выніках канферэнцыі пабачыць свет зборнік навуковых дакладаў выступоўцаў.

Т.К.

Калекцыі пераможнай вясны

На выстаўцы “Пасляваенная вясна”, якая адкрылася ўчора ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўлены прадметы жаночага адзення і аксесуараў 1940 — 1960 гг.

Дамскія сумачкі, капялюшыкі, жабо, парасоны, вееры, упрыгожанні… Агульная колькасць экспанатаў — больш за 600. Штосьці ўзята з музейных запаснікаў, але значная частка — з сямейных куфраў. Загадчык аддзела развіцця музея Тамара Курганава, якая спрычынілася да арганізацыі выстаўкі, нагадала, што падобныя культурныя акцыі з дапамогай грамады ўстанова ладзіць з 2009 года. Арганізатары звяртаюцца да мінчан на музейным сайце, у прэсе, у тым ліку — і праз старонкі “К”, праз абвесткі ў метро, і людзі прыносяць рэчы з сямейных архіваў, з бабуліных ды матчыных куфраў. Плён такога супрацоўніцтва — і дадзеная экспазіцыя. Між іншым, некаторыя не перарываюць сувязі з установай з таго самага 2009-га.

Кожная рэч у экспазіцыі — не проста сведчанне часу, а, у пэўнай ступені, хроніка сэрца. Бо ў цяжкія пасляваенныя гады пантофлікі або капялюшык былі дарагім дарункам лёсу ці блізкага чалавека. Замшавыя сумачкі, капронавыя пальчаткі, срэбраныя пудраніцы, брошкі — гэта сведчанне таго, што жахі вайны не здолелі знішчыць у людзях прагу прыгажосці, знак таго, што жыццё — працягваецца.

На выстаўцы кожны зможа не толькі пабачыць пераможную вясну, але і адчуць яе водар: гэта духі “Красная Москва” фабрыкі “Новая заря”. Можна таксама “прымерыць” модныя фасоны той пары і сфатаграфавацца ў “бабулінай сукенцы”.

П.В.

На здымках: фрагменты экспазіцыі дэманструюць супрацоўніцы музея Алена Сямашка (на фота ўверсе) і Настасся Наркевіч.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Графскі тытул? З лёгкасцю!



Міжнародны дзень тэатра як нагода для прэм’еры — пад такім дэзізам ужо не першы год сустракае прафесійнае свята Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр. 25 сакавіка там стартуе новая пастаноўка аперэты "Граф Люксембург" Ферэнца Легара.

Рыхтуючы сцэнаграфію, Любоў Сідзельнікава і сапраўды пабывала ў Парыжы — праўда, з іншай прычыны: каб адкрыць сваю выстаўку літаграфій. "Убачыўшы на свае вочы гэты горад ліхтароў і мастоў, — сказала мастачка, — гару Манмартр, якая сама ўжо стала сімвалам мастацтва, я пераканалася, што ўсё адлюстравала дакладна: і ў цяперашнім "Графе Люксембургу", і ў эскізах да "Капелюша Напалеона", які ўвосень будзе пастаўлены ў Карагандзе — таксама, дарэчы, у рэжысуры Сусанны Цырук…"

Сама ж Сусанна Юр’еўна прызналася, што імкнулася паставіць спектакль-свята, поўны атмасферы феерверкаў і шампанскага — усяго таго, што яна адчувае ў гэтай музыцы, поўнай неверагоднай "лёгкасці быцця". Пэўна, тое ж адчуваў і бізнесмен, спявак-аматар Рыгор Баразна, калі з лёгкасцю прапанаваў тэатру спонсарскую дапамогу, аплаціўшы выраб дэкарацый і касцюмаў. Праўда, тая "лёгкасць", як і ў мастацтве, стала вынікам працяглай папярэдняй падрыхтоўкі: перш чым прыняць такое рашэнне, ён прагледзеў ледзь не ўвесь рэпертуар тэатра, і — па некалькі разоў.

Ну, а каб дасягнуць лёгкасці ў выкананні, рэпетыцыі ідуць штодня, па звыклай схеме: ранак — вечар. Яно таго варта: у розных складах спектакля мы ўбачым не толькі прызнаных зорак, але і зусім маладых артыстаў — ажно пецярых дэбютантаў, якія ўжо добра зарэкамендавалі сябе на гэтай сцэне пакуль у невялічкіх партыях і тэатралізаваных канцэртах. Чарговы раз уразіць гледача рыхтуюцца і артысты хору: апошнім часам, як можна было заўважыць па многіх спектаклях, яны не толькі спяваюць, дасягнуўшы ўзроўню лепшых акадэмічных калектываў, але і скачуць — з амаль балетнай лёгкасцю.

На здымку: рэжысёр Сусанна Цырук (другая злева) і пастановачная група ў час рэпетыцыі знаёмяцца з бутафорыяй будучага спектакля.
Фота Юрыя ІВАНОВА

Сёлета Міжнародны фестываль духоўнай музыкі “Магутны Божа” пройдзе з 25 па 29 чэрвеня.

Тры летнія — міжнародныя

Пасяджэнне аргкамітэта форуму, паводле слоў начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Сінкаўца, адбудзецца на наступным тыдні. Прычым гаворка на ім пойдзе адразу пра тры фестывалі: “Залатая пчолка” ў Клімавічах, “Вянок дружбы” ў Бабруйску і “Магутны Божа” ў Магілёве. Усе яны — міжнародныя.

Цягам летніх месяцаў Магілёўшчына прымае тры міжнародныя фестывалі.

Што ж да магілёўскага фестывалю, дык арганізатары мусяць парупіцца, каб ён ахапіў як мага больш пляцовак у Магілёве і за яго межамі, каб на ім быў прадстаўлены увесь спектр духоўнай музыкі. Для гэтага цяпер вядуцца перамовы як з каталіцкім, так і з праваслаўным духавенствам.

Нагадаем, арганізатары фэсту — Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт і Рымска-каталіцкі прыход Магілёва. Для ўдзелу ў фестывалі запрашаюцца харавыя калектывы, салісты-вакалісты, камерныя ансамблі. А ў складзе журы, па традыцыі, — вядомыя дзеячы культуры Беларусі, а таксама краін замежжа: Германіі, Польшчы, Расіі, Украіны ды іншых.

“Дзед”, “…Прымаўкі” ды Старэвіч

Беларускія аніматары атрымалі прэстыжныя ўзнагароды — дыпломы журы — XVII Адкрытага расійскага фестывалю анімацыйнага кіно, што праходзіў у сакавіку ў Суздалі.

Высокіх адзнак удастоены рэжысёры Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” Міхаіл Тумеля і Аляксандр Ленкін за свае стужкі “Беларускія прымаўкі” і “Дзед”.

На фестывалі, які штогод праходзіць пры падтрымцы Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі, былі прадстаўлены лепшыя анімацыйныя работы з прасторы былога СССР ды іншых краін.

Апрача конкурснай праграмы, адбыліся шматлікія рэтраспектыўныя паказы, а таксама ўпершыню было прадэманстравана сто лепшых фільмаў па выніках глядацкага галасавання ў Інтэрнэце. Гэтым разам фестывальныя мерапрыемствы прысвяцілі 100-годдзю з дня выхаду першай анімацыйнай стужкі беларуса Уладзіслава Старэвіча, якая лічыцца расійскімі аніматарамі за “кропку адліку” існавання мультыплікацыйнага мастацтва ў іх краіне.

Усяго ў “Суздалі-2012” удзельнічала амаль 400 рэжысёраў, мастакоў, а таксама іншых прафесіяналаў анімацыйнай справы з 20 краін свету. Гран-пры фестывалю “За лепшы фільм” гэтым разам атрымала карціна “Заснежаны вершнік” рэжысёра Аляксея Туркуса.

Беларускія ж аніматары — сталыя ўдзельнікі фестывалю ў Суздалі, якія неаднойчы атрымлівалі прызы і дыпломы журы на гэтым прэстыжным кінафоруме.

На здымку: кадр з мультфільма "Беларускія прымаўкі".

У Гальшанскім замку пакуль без змен: старая цэгла пакрысе ператвараецца ў друз, падпарадкоўваючыся няўмольнаму закону энтрапіі. Але "зваротны адлік" ужо пачаўся. Добра "раскручаны" нашым класікам Уладзімірам Караткевічам помнік спадчыны фігуруе адразу ў дзвюх дзяржаўных праграмах: "Культура Беларусі" і "Замкі Беларусі". І гэта — не фармальны факт у гісторыі Гальшанскага замка, але акурат тое звяно, якое забяспечыць яе працяг. Праграмы пачалі дзейнічаць. На захаванне замка ўжо выдаткавана паўмільярда рублёў з бюджэту Гродзенскай вобласці, а да канца года гэтая сума мае павялічыцца, прынамсі, удвая за кошт бюджэту рэспубліканскага.

— Наша першачарговая задача — правядзенне супрацьаварыйных работ, — распавёў начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ігар Чарняўскі. — Пачаць плануецца з той кутняй вежы замка, якая захавалася лепш за іншыя яго часткі. Тым больш, ёсць навуковыя падставы для правядзення яе паўнавартаснай рэстаўрацыі.

— Кутняя вежа знаходзіцца ў структуры руінiраванага корпуса, — дадае навуковы кіраўнік аб'екта Нэлі Дарашкевіч. — Адпаведна, як толькі мы закранём яе кансервацыйнымі ці рэстаўрацыйнымі мерапрыемствамі, непазбежна давядзецца распачаць работы і на прылеглай частцы замка. Акрамя таго, мы не павінны забывацца і на экспазіцыйныя вартасці аб'екта, каб не пагоршыць звыклы вобраз помніка.

У Гальшанскім замку

Як "удыхнуць" у "руіны трывалыя" душу і навошта ў дэкоры аб'екта спадчыны клеткі для трусянят?

Руіны вялікай залы маюць быць закансерваваны і стаць "руінамі трывалымі". На гэтым першы этап адраджэння Гальшанскага замка, які і прадугледжваюць згаданыя дзяржпраграмы ды закладзены ў іх аб'ём фінансавання, павінен паспяхова завяршыцца — як мяркуецца, для гэтага спатрэбіцца ўсяго некалькі гадоў. Хочацца верыць, што ў такім жа самым тэмпе працягнецца і кансервацыя астатняй часткі замка. А ў адрэстаўраванай вежы з'явіцца невялічкая музейнай экспазіцыя.

Але ж многія пытанні, датычныя функцыянавання руін як паспяховага тураб'екта, усё ж застануцца нават і пасля гэтага. Іх паэтапнае вырашэнне запатрабуе не адзін год. Дый, мабыць, не адна дзіда будзе зламана ў вострых дыскусіях на тэму, як можа і павінен выглядаць замак у XXI стагоддзі. Няцяжка прадбачыць і тое, што ў іх эпіцэнтры апынуцца папраўдзе смелыя ды неардынарныя ідэі, якія прапануюць старшыня архітэктурнага бюро Беларускага камітэта ICOMOS Ігар Раханскі ды яго паплечнікі. Ужо чатыры гады яны на грамадскіх пачатках распрацоўваюць імаверныя варыянты будучыні пашчэрбленых руін.

Зрэшты, тую будучыню ім трэба яшчэ забяспечыць... Як адзначыў Ігар Чарняўскі, менавіта гэта сёння з'яўляецца прыярытэтнай задачай.

На пачатку — лініі электраперадач

Ашмянскі раён распачаў падрыхтоўку да кансервацыі замка задоўга да зацвярджэння згаданых дзяржаўных праграм. Для мясцовых улад гэтая ініцыятыва даўно стала "праграмнай". Колькі гадоў таму мы абмяркоўвалі яе з тагачасным намеснікам старшыні райвыканкама Валянцінай Лузінай (цяпер — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны). Ейны наступнік на гэтай пасадзе Аляксандр Саванец ледзь не слова ў слова паўтарыў пазіцыю сваёй папярэдніцы: захаваць замак — наш першачарговы маральны абавязак. Адпаведна, да кардынальных зрухаў у гэтай справе на Ашмяншчыне рыхтаваліся паслядоўна і... не толькі маральна.

— Яшчэ некалькі гадоў таму з тэрыторыі гэтай культурнай каштоўнасці былі вынесены лініі электраперадач, — распавядае метадыст аддзела культуры райвыканкама Сяргей Жылік. — Гэта абышлося райбюджэту ў немалую суму: 110 мільёнаў рублёў. А літаральна напрыканцы мінулага года быў зацверджаны і праект ахоўных зон…

Сродкі на правядзенне рэстаўрацыі і кансервацыі выдаткоўваюцца з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, а вось выконвацца работы будуць "сваімі сіламі". Заказчыкам выступіць раённае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва, а генпадрадчыкам — мясцовая будаўнічая арганізацыя. Кіраўніцтва Ашмяншчыны мяркуе, што "тутэйшыя" будаўнікі справяцца з гэтымі спецыфічнымі задачамі. Але — пры адной умове: належнай дапамозе прафесіяналаў у справе рэстаўрацыі. Няма сумневу ў тым, што ў дадзеным выпадку яна неабходная.

— У свеце існуе шэраг тэхналогій кансервацыі падобных помнікаў спадчыны, нашым спецыялістам яны таксама знаёмы, — распавядае Ігар Чарняўскі. — Возьмем, да прыкладу, замак у Каўнасе: у яго кансервацыі мы не ўбачым ніякіх "хітрамудрых" прыёмаў. Метал з палімерным пакрыццём, каронкі на сценах, часам кансервацыйную функцыю выконваюць новыя фрагменты муроўкі, адбудаваныя спецыяльна для таго, каб "прыкрыць" аўтэнтычную.... Таму застаецца толькі выбраць тыя тэхналогіі, якія найбольш пасуюць канкрэтнаму аб'екту, яго цяперашняму стану. І гэта справа не толькі архітэктараў, але і хімікаў, тэхнолагаў...

Комплексныя даследаванні Гальшанскага замка праводзіліся на пачатку 1980-х гадоў. Ігар Чарняўскі прымаў у іх удзел у якасці археолага ў складзе архітэктурна-археалагічнай экспедыцыі колішніх Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў Міністэрства культуры БССР.

— Плён гэтай працы быў багаты, але, зразумела, зусім не вычарпальны, — распавядае ён. — Нам удалося высветліць этапы будаўніцтва замка, "адшукаць" у яго абліччы тыповыя рэнесансавыя прыёмы… Сярод знаходак была і кафля з гербам Сапегаў. Але археалагічныя шурфы тады ставілі сабе за мэту менавіта падмацаваць архітэктурныя даследаванні. Адпаведна, капаць у замку яшчэ ёсць дзе. Праўда, вельмі сумняваюся, што на яго тэрыторыі поўнасцю захаваўся культурны слой: як вядома, там знаходзіўся кароўнік, і ўсё карыснае магло быць вывезена разам з гноем…

Тым не менш, даследаванні замка павінны прадоўжыцца адначасова з яго кансервацыяй. Амаль уся тэрыторыя пакрыта цяпер бітай цэглай, перамяшанай з зямлёю. Нэлі Дарашкевіч спадзяецца, што расчыстка гэтых завалаў можа не толькі паспрыяць далейшаму вывучэнню помніка, але і значна "пашырыць" яго плошчу ды павялічыць інтарэс турыстаў. Пагатоў, чуткі пра сутарэнні ды лёхі з'явіліся тут ці не ўпершыню на Беларусі.

Што ж да бітай цэглы... Раней яе проста вывозілі на сметнік. Але Ігар Раханскі пераканаць ў тым, што нават друз можа зноў пайсці ў справу. Сплеценыя з лазы кошыкі-габіёны ў пачатку XVII стагоддзя выкарыстоўвалі як сродак палявой фартыфікацыі, а сёння яны набылі "другое дыханне": зробленыя з жалеза клеткі-габіёны, напоўненыя каменнем, выкарыстоўваюцца ў архітэктуры і ландшафтным дызайне.

— Прасцей кажучы, гэта штучныя мадэлі, сплеценыя з простай сеткі-рабіцы (вельмі падобныя знешне на клеткі для трусянят), якія напаўняюцца кавалкамі цэглы з разборкі завалаў у руінах і могуць служыць своеасаблівымі элементамі дэкору неэстэтычных кансервацыйных канструкцый, — распавядае праекціроўшчык. — І руіны ад друзу расчысцім, і аўтэнтычны матэрыял для нашчадкаў захаваем, і на ўтылізацыі смецця сэканомім. Выдаткі ж — мізэрныя. Рэстаўратары з Італіі тут, як вы самі разумееце, не спатрэбяцца, затое з'явіцца праца для мясцовых жыхароў. Дарэчы, непасрэдна далучыць іх да адраджэння замка — гэта найлепшая прафілактыка вандалізму. Чалавек псіхалагічна не здатны нішчыць тое, што ён зрабіў сваімі рукамі…

Супрацьвандальны антымост

Добра памятаю той час, калі да замка трэба было ісці па гразі, ды і "водар" там быў характэрны. Натуральна, тыя праблемы даўно вырашаны "мясцовымі сіламі", і просценькія дарожкі са жвіру выглядаюць тут нават лепш, чым маглі б выглядаць "праменады", выкладзеныя сучаснай пліткай.

Па словах начальніка аддзела культуры Ашмянскага райвыканкама Галіны Балінскай, суботнікі ў Гальшанскім замку ладзяцца рэгулярна: толькі работнікі культуры раёна выпраўляюцца туды з гэтай мэтай, прынамсі, двойчы на год. Але... "Для поўнага шчасця" гэтых захадаў, відавочна, недастаткова. Дый магчымасці Гальшанскага сельсавета, на чыім балансе знаходзіцца замак, — зусім мізэрныя. А вось асобнай стаўкі для чалавека, які падтрымліваў бы гэтае месца ў парадку — хаця б на пасадзе вартаўніка або дворніка, — на жаль, пакуль што не прадугледжана.

Параўноўваць Гальшанскі замак са сметнікам сёння зусім некарэктна, але... бітыя пляшкі пасярод муроў часам усё ж сустракаюцца. Чым можа скончыцца такая "рамантычная вячэра", не трэба нават і тлумачыць, бо перасоўвацца па гальшанскіх руінах без рызыкі для здароўя здатныя хібы толькі прывіды.

— Добраўпарадкаванне — адзін з найважнейшых элементаў нашай працы, — запэўніў Аляксандр Саванец. — Той стан, у якім тэрыторыя замка знаходзіцца цяпер, абсалютна недапушчальны!..

Варта спадзявацца, што частковая музеефікацыя замка сама сабой паспрыяе падтрыманню парадка. Але пытанне абмежавання доступу на даволі вялікую тэрыторыю помніка спадчыны ўсё адно застанецца адкрытым. І яно актуальнае не толькі з меркантыльных прычын — "бясплатных" замкаў у Еўропе небагата. Важны і іншы аспект: перафразуючы прымаўку, у сям'і не без... вандала.

Менавіта дадзеная акалічнасць, актуальная не толькі для нашай краіны, і абумовіла з'яўленне ці не самай спрэчнай дэталі ў атачэнні Мірскага замка — жалезнай агароджы. Напэўна, аўтары гэтай задумы цалкам прадбачылі той шквал крытыкі, які на іх меў абрынуцца — і абрынуўся! Але ўсё ж такі скарысталіся "тэорыяй меншага зла".

Тым не менш, чалавечая думка не стаіць на месцы. Ігар Раханскі прапанаваў свой варыянт супрацьвандальных захадаў, які не глядзіцца бяльмом на фоне старых муроў. Чаму б не абкружыць руіны запоўненым вадой ровам? Ці, дакладней, яго "муляжом", бо рэканструяваць сапраўдны сёння немагчыма з-за поўнай адсутнасці звестак пра яго. Архітэктар прадумаў і арыгінальны спосаб легальнага пераадолення гэтай воднай перашкоды. Нечым ён нагадвае вядомы эпізод з Бібліі пра фарсіраванне Чырвонага мора пасуху.

— Я назваў гэтую канструкцыю антымостам, — дадаў Ігар Раханскі.

На рэндэрах яна выглядае эфектнай, але даволі простай: дзве сцяны ўтвараюць паміж сабой вузкі "сухі" тунэль, што перасякае

пакуль без змен?,

або Самы просты метад захавання помніка — узяць ды скасіць тую крапіву

тоўшчу вады (а не навісае над яе паверхняй), які ўдзень будзе перакрываць білецёр, а ўночы — жалезныя краты. На агульную панараму замка ўсе гэтыя дэталі, як падаецца, амаль не паўплываюць. І ўжо хаця б таму такі варыянт варты ўвагі.

Літаральна за якую сотню метраў ад старых муроў — пабудовы зернесушыльнага комплексу. Як распавёў Аляксандр Саванец, іх вынас пакуль падаецца даволі праблематычным. Адпаведна, застаецца хіба што неяк іх "закамуфляваць". Адсюль — і новая задача для дызайнераў.

— Закрыўшы гэтыя пабудовы, скажам, нейкімі банерамі, мы здолеем нават пашырыць "сферу прысутнасці" замка, — лічыць намеснік старшыні райвыканкама.

Такім чынам, без крэатыву тут у любым выпадку не абысціся.

Інвестыцыйны бум

Па колькасці і значнасці гісторыка-культурных адметнасцей цяперашняя вёска Гальшаны — адзін з лідараў у сваёй "вагавой катэгорыі", разам са Смальянамі, што на Аршаншчыне. Турыстызацыя вотчыны Сангушкаў, лічы, яшчэ і не пачыналася, а вось у Гальшанах гэты рух ідзе поўным ходам. Ці шмат у нас вёсак, дзе на галоўнай плошчы размешчаны ажно тры кавярні і два гатэльчыкі? Прычым, як сведчаць мясцовыя жыхары, яны не пустуюць. Таму неўзабаве з'явіцца і яшчэ колькі аб'ектаў інфраструктуры: прыватнікі выкупілі каларытны будынак колішняй гміны і дысанансны кінатэатр савецкага часу. Толькі вось старэнькі млын пакуль гібее па-ранейшаму, хаця і ён ужо — прыватная ўласнасць! Па нашых мерках, дык сапраўдны інвестыцыйны бум!

— Мы перакананы ў тым, што замак трэба ўспрымаць як адзін з элементаў культурнага ландшафту Гальшанаў, які ўяўляе з сябе цэлую сукупнасць антрапагенных і прыродных складнікаў, — кажа Ігар Раханскі.

На маніторы яго камп'ютара з'яўляецца спадарожнікавая карта. З яе дапамогай архітэктар папулярна тлумачыць сутнасць паняцця "культурны ландшафт". У выніку атрымліваецца ладная экскурсійная праграма, няхай сабе і ў віртуальным фармаце:

— Непадалёк ад мястэчка — гарадзішча першага замка, пабудаванага яшчэ князем Гольшам. Ідзём далей — бачым старыя яўрэйскія могілкі: пліты з надпісамі на незразумелай мове, гэты сімвал прамінулай ужо эпохі жыцця Гальшанаў, нешта загадкавае для нас і кранальнае... Далей — прыроднае ўтварэнне, кар'еры з сажалкай. Адпаведна, у перспектыве маем добрую рэкрэацыйную зону. Далей рушым у самі Гальшаны, аглядаем касцёл з кляштарам, па вузкай вулачцы паўз старыя дамкі шыбуем да царквы, потым бачым прыдарожную капліцу... І толькі тады падыходзім да замка. Але ж не забудзьцеся яшчэ і пра адзін з пунктаў Дугі Струвэ, які размешчаны непадалёк ад мястэчка…

Добрая палова згаданых вышэй адметнасцей на сёння не з'яўляецца аб'ектамі паказу. Бо каб зацікавіць імі турыста, іх трэба належным чынам "падаць". Тая самая Дуга Струвэ са спісу Сусветнай спадчыны UNESCO трывала займае першае месца ў рэйтынгу славутасцей, пра якія ўсе чулі, але ніхто не ведае, што гэта такое.

На Ашмяншчыне спадзяюцца вырашыць гэтую праблему. Віртуальны музей, які неўзабаве з'явіцца ў Гальшанскай бібліятэцы дзякуючы выйгранаму аддзелам культуры гранту, прызначаны забяспечыць турыста належным аб'ёмам інфармацыі ў зручнай ды папулярнай форме. Адпаведна, і пункт Дугі Струвэ пасля гэтага павінен "запрацаваць".

Эфект ажыўлення, або "З турыстамі мы неяк размінаемся..."

Руіны Гальшанскага замка ўжо сёння "пераконваюць" тысячы турыстаў, але цяжка спрачацца з тым, што іх сапраўдны патэнцыял пакуль схаваны пад згаданым ужо друзам. Аляксандр Саванец звярнуў асаблівую ўвагу на "падачу" гэтага своеасаблівага аб'екта, які, безумоўна, належыць не толькі да матэрыяльнай спадчыны.

— Дагэтуль мы, па сутнасці, проста канстатавалі перад турыстамі факт наяўнасці гэтых руін, — кажа намеснік старшыні райвыканкама. — Сёння перад намі стаіць задача, куды больш складаная: трэба іх належным чынам паказаць, праэкспанаваць. Таму кансервацыі павінны наступствацаць менавіта гэтыя захады…

Рэвіталізацыю помніка спадчыны сёння многія разумеюць літаральным чынам: як яго "ажыўленне". Менавіта такое значэнне мае моднае слова "анімацыя". І сапраўды, "ажылы вобраз" у латах або доўгай сукенцы цудоўна стварае адпаведны антураж для турыстаў. Пад час кожнага з фестываляў "Гальшанскі замак", якія сталі ўжо традыцыйнымі, іх збіраецца па некалькі тысяч. У размаітай палітры айчынных "рыцарскіх" імпрэз гэтая вылучаецца перадусім той акалічнасцю, што яна арганізоўваецца без прыцягнення бюджэтных сродкаў. Партнёрства, наладжанае паміж аддзелам культуры і турфірмай з Мінска, не прынесла вялікіх грашовых дывідэндаў ніводнаму з бакоў. Затое эфект ажыўлення — навідавоку.

Сёлета фэст мяркуецца зрабіць дабрачынным — на карысць адраджэння замка. А налета ён мае набыць новыя маштабы. Аддзел культуры выйграў яшчэ адзін грант па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва. Ён дазволіць вельмі сур'ёзныя выдаткі і на добрыя гістарычныя касцюмы, і на печ для абпалу керамікі разам з ганчарным кругам, і нават на абсталяванне для ўласнага цэнтра турыстычнай інфармацыі... Адпаведна, праектная дзейнасць прыносіць свой плён. Калі ёю займацца.

Фэст, як вядома, хутка прамінае. А вазіць аніматараў-"варагаў" у Гальшаны было б нерэнтабельна. Адзіная "панацэя" тут — абыходзіцца ўласнымі сіламі. І ў сценах Гальшанскага СДК ужо падрыхтавана адмысловая праграма "з прывідамі". Праўда, турыстам яе пакуль не паказваюць, і зусім не з прывідных прычын.

— На жаль, з турыстамі мы неяк размінаемся, — уздыхае Галіна Балінская. — Іх прыезд сюды адбываецца незалежна ад нас. Раней, калі ў кляштары месціўся філіял Нацыянальнага мастацкага музея, быў хаця б нейкі "цэнтр прыцягнення", а цяпер...

Кляштар пару гадоў таму заканамерна адышоў ва ўласнасць каталіцкай парафіі. Рэстаўрацыя напаўаварыйнага будынка пакуль не пачыналася, але затое на ім з'явіліся новыя вадасцёкі, а вокны пазабіваны свежымі шчытамі. Гэта толькі пацвярджае агульнавядомую аксіёму: калі ў помніка спадчыны ёсць сапраўдны ўласнік, ён знойдзе магчымасці, каб парупіцца пра захаванне маёмасці.

У тым, што музей у Гальшанах патрэбны бы паветра, сумняваць не выпадае. На жаль, з часоў мінулай нашай публікацыі на дадзены конт (гл. "К" №№ 44 — 45 за 2008 г.) сітуацыя не змянілася. Але работы на Гальшанскім замку маюць вырашыць праблему. Менавіта для гэтага кутняя вежа будзе цалкам адрэстаўравана. Вядома, вялікую экспазіцыю там не змесціш, але нейкі цэнтр усё ж з'явіцца.

— Задумак багата, — распавядае Галіна Балінская. — Хочацца прадставіць дынастыю Ягелонаў: яе прамаці Софія Гальшанская — гэта наш своеасаблівы "брэнд", які нам трэба піярыць як толькі магчыма.

Падыход у "родных пенатах"

Ёсць, зрэшты, і прынцыпова іншы погляд на гэтую праблему. Канцэпцыя экспанавання Гальшанскага замка была распрацавана яшчэ чатыры гады таму па замове Ашмянскага райвыканкама. Аўтарскі калектыў пад кіраўніцтвам Ігара Раханскага прапанаваў ператварыць руіны ў своеасаблівую гіперінсталяцыю, якая адсылала б гледача да "вечных тэм" ды натхняла на філасофскія роздумы. "Музей у "адноўленым замку"? Не, музей "з руін замка" — так фармулюецца "соль" гэтай ідэі. "Сцэнарый экспанавання руін задуманы як уяўны рытуал "пасвячэння ў спадкаемцы", — тлумачаць аўтары, вызначаючы тры фазы гэтага працэсу: азнаямленне, ацэньванне, асваенне.

Паводле іх задумы, комплекс павінен быць падзелены на тры зоны: "Паветраны замак", "Паралельны свет", "Жыццё пасля смерці". Усе яны знітоўваюцца ў лагічны сцэнарый з запланаваным катарсічным эфектам. Але варта адразу адзначыць, што згаданы тэматычны падзел бадай не аб'ектываваны самой семантыкай прасторы: у руінах тыя дэмаркацыйныя лініі амаль не прасочваюцца — іх "дамалёўвае" аўтарская фантазія. Адпаведна, адзіны "артэфакт" гэтага музея — рэшткі муроў — напаўняецца сучаснай арыгінальнай "начынкай", пра якую Сапегі нават думаць не думалі. "Асяроддзе фарміруецца сродкамі розных тэхналогій выяўленчага мастацтва (а не толькі архітэктуры), уключна са стварэннем своеасаблівых пластычных мадэлей рэальных прадметаў у якасці дэкаратыўна аздобленага музейнага абсталявання", — загадкава дэталізуюць свае задумы аўтары канцэпцыі.

Варта адзначыць, што такі падыход, звыклы для замежжа, у родных пенатах падаецца, бадай, рэвалюцыйным: гэта даволі рашучае адмаўленне ад прынцыпаў узнаўлення муляжоў помнікаў на падставе навуковай рэканструкцыі, якіх у нас — у той ці іншай ступені ды з пераменным поспехам — зазвычай прытрымліваюцца ў падобных выпадках. Канкрэтны помнік спадчыны, па сутнасці, прапануецца зрабіць нагодай і пляцоўкай для выяўлення аўтарскіх ідэй прадстаўнікоў розных творчых галін.

Ці прымяняльны такі падыход да помнікаў спадчыны ў прынцыпе? Ці дапушчальны такі "гібрыд" замка і — па сутнасці — твора сучаснага мастацтва?

— Чаму ж не? — адказаў на маё пытанне Ігар Чарняўскі. — Калі мысліць катэгорыяй "у прынцыпе", гэта ўсё дапушчальна, але... Мы павінны быць рэалістамі і дакладна вызначаць надзённыя прыярытэты. Бо інакш прымяняць тыя "ноу-хау" папросту не будзе дзе. Так, іх можна і трэба выкрышталізоўваць, іх варта абмяркоўваць пад час дыскусій ды семінараў, каб ужо загадзя падрыхтавацца да наступных этапаў рэвіталізацыі помніка. Аднак паўтаруся: на сёння Гальшанскі замак патрабуе перадусім элементарных мер па захаванні. І гэта датычыцца, дарэчы, зусім не толькі яго, але і многіх іншых нашых гістарычных набыткаў, якія патрабуюць менавіта самых простых і танных захадаў па іх уратаванні. Калі мы не займемся гэтым зараз, дык і дыскутаваць неўзабаве ўжо не будзе пра што. Таму сёння трэба зрабіць абсалютна канкрэтныя, практычныя захады па ўратаванні помніка, разлічваючы на тыя сродкі, якія ёсць у наяўнасці. А потым, калі наступны этап наспее сам сабою, можна будзе спакойна абмеркаваць усе смелыя ідэі…

Па вялікім рахунку, з такой стратэгіяй паэтапных (і пасільных) дзеянняў згодны і Ігар Раханскі. Тым больш, ён гатовы падзяліцца ўласным досведам яе ўвасаблення ў жыццё:

— Гэтым летам мы вырашылі даследаваць руіны замкавай капліцы, але... Тое месца спрэс зарасло крапівой, і рэшткі муроўкі цалкам у ёй патаналі, нават дабрацца да іх не было як. Нам закарцела нешта зрабіць для замка ўласнымі рукамі. Паставілі задачу — і кожны чацвер ездзілі ў Гальшаны. Выкасілі крапіву, абмерылі руіны, удакладнілі абрысы, разам з мясцовымі жыхарамі мы зрабілі крыж, каб пазначыць гэтае месца... І адразу туды пайшлі турысты. Самы просты метад экспанавання — узяць ды скасіць тую крапіву…

"На сёння Гальшанскі замак патрабуе перадусім элементарных мер па захаванні... Калі мы не займемся гэтым зараз, дык і дыскутаваць неўзабаве ўжо не будзе пра што. Таму сёння трэба зрабіць абсалютна канкрэтныя, практычныя захады па ўратаванні помніка, разлічваючы на тыя сродкі, якія ёсць у наяўнасці. А потым, калі наступны этап наспее сам сабою, можна будзе спакойна абмеркаваць усе смелыя ідэі..."

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Гальшаны — Мінск

Учора і сёння Тбіліскі дзяржаўны тэатр оперы і балета імя З.Паліяшвілі на чале з непераўзыдзенай Нінай Ананіяшвілі ў якасці мастацкага кіраўніка і салісткі дорыць нашай публіцы ажно сем аднаактовых балетаў. Ніна АНАНІЯШВІЛІ — сусветна вядомая зорка, імя якой не патрабуе дадатковых каментарыяў і прадстаўленняў. Аднойчы ўбачыўшы яе на сцэне, не забудзеш аніколі. Як гэта ні дзіўна для балета, але першае, на што звяртаеш увагу, — вялізныя выразныя вочы на элегантна-хударлявенькім тварыку, бачныя з любога раду балкона. То пранікнёна-трапяткія, то графічна-вытачаныя рукі — яшчэ адна выява душы. Абсалютная тэхнічная бездакорнасць і, галоўнае, пранізлівая эмацыйнасць, асаблівая асэнсаванасць кожнага руху...
Мы яшчэ толькі шукаем у фае тэатра ціхі, утульны куточак, а яна ўжо пачынае размову:

Вы падарылі нам — балет!

Эксклюзіў "К"

Ніна АНАНІЯШВІЛІ: чаго не можа сабе дазволіць чалавек "мужнай" прафесіі?

— Ой, я такая гаспадарлівая! Мае сябры ў Маскве жартам называюць мяне «загадчык гаспадаркі». Я ў сваім тэатры заўсёды за ўсім сачу, каб усё было чыста, прыбрана, на сваіх месцах — каб паўсюль і ва ўсім быў парадак. І калі прыязджаю да вас, дык з такім задавальненнем, нават непрыхаваным захапленнем гляджу на адрэстаўраваны тэатр: як акуратна ўсё зроблена! Так што, відаць, няблага будзе сабраць беларускую брыгаду будаўнікоў — і адвесці яе ў Грузію, каб рамонт у нашым Тбіліскім тэатры скончыўся хутчэй!

— Няўжо ў вас планы на адных будаўнікоў? А на нашых артыстаў, на абменныя гастролі? Пэўна, ужо штосьці намечана на будучыню?

— Літаральна сёння ўжо абмяркоўваліся магчымасці гастролей вашага Вялікага тэатра ў Тбілісі. Плануецца, што рамонт у нас завершыцца напрыканцы 2013 года, праз сезон, і мы будзем рады бачыць вашу трупу на нашай сцэне. Але ж з асобнымі беларускімі артыстамі мы ўжо супрацоўнічалі.

— З Ігарам Артамонавым, я ведаю, вы рыхтавалі два спектаклі, ездзілі з ім на гастролі…

— Гэтыя пастаноўкі вы ўбачыце і зараз. Нам вельмі хацелася прадставіць штосьці сумеснае. Але спектакль «Падарунак да дня нараджэння» з харэаграфіяй Фрэдэрыка Эштана, у якім удзельнічаў ваш Дзяніс Клімук і ездзіў з намі ў Італію, мы, на жаль, паказаць не зможам, бо не зроблена фанаграма. Дарэчы, некаторыя спектаклі, прывезеныя цяпер, пойдуць у суправаджэнні вашага аркестра, але з нашым дырыжорам Давідам Мукерыя.

— Сімвалам сяброўства можна лічыць і тое, што сёлета Міжнародны дзень тэатра вы сустракаеце ў нас, — яшчэ адна, можна сказаць, сумесная «дзея». Як увогуле адзначаеце гэтае свята?

— Працай. І вельмі радуюся, калі яго адзначаюць не толькі артысты, але і астатнія: значыць, надаюць тэатру ўвагу. Сёння вельмі складана заставацца ў мастацтве. І ўсе, хто прысвячае яму жыццё, — героі, бо гэта штодзённая цяжкая праца, пастаянныя сумневы, перажыванні… Ёсць шмат іншых прафесій, дзе куды лягчэй і дзе нават можна рэалізаваць свой творчы патэнцыял не горш, чым у мастацтве, а плацяць там нашмат больш. Таму тыя, хто ўсё ж застаецца, — гэта папраўдзе адданыя людзі, якія без таго ж тэатра папросту не пражывуць...

Артыст балета — вельмі мужная прафесія. Аднойчы мяне запрасілі на тэлебачанне — паўдзельнічаць у праграме пра балет. І я прапанавала: «Давайце я зраблю вам шоу». «Сям'ю, мабыць, сваю прыведзяце?» — «Не, артыстаў». Запрасіла некалькіх салістаў свайго тэатра — і алімпійскага чэмпіёна па барацьбе. Ён увесь такі «напампаваны», мускуламі грае. А мае балетныя — бы трасцінкі-чарацінкі. Я прашу алімпійца: «Узніміце мяне, як у балеце». Ён на рукі ўзяў, а каб над галавой узняць, папацець давялося. Нашы ж артысты — у імгненне вока закідваюць. І адной рукой трымаюць! Дык хто насамрэч дужэйшы?.. Таму дзякуй усім, хто нам дапамагае. Я не стамляюся паўтараць: кожны глядач, які купляе білет і прыходзіць на спектакль, — гэта наш «спонсар». Без публікі і яе апладысментаў мы не зможам існаваць. Гэта тыя хвіліны шчасця, за якія мы і працуем…

— А сам тэатр для вас — гэта што: трупа, рэпертуар, глядач, другая сям'я?..

— Гэта жыццё. Нават не ведаю, чым я займалася б, каб не тэатр. Пэўна, рабіла б што-небудзь — мабыць, стала б геолагам, як бацька. Ці, можа, «гаспадарнікам» на якім-небудзь прадпрыемстве, бо люблю парадак. Але тэатр падпарадкоўвае сабе тваё жыццё. Мы праводзім у ім больш часу, чым дзе. За ўсё жыццё я свайго педагога Раісу Стручкову бачыла, бадай, часцей, чым родную маці. І мая дачка "гадавалася" ў тэатры: я бачыла яе тут часцей, чым дома. Калі была маленькай, брала яе з сабой на гастролі. Цяпер яна ўжо школьніца, водзіць у тэатр аднакласнікаў. І вельмі засумавала, што я не ўзяла яе з сабой у Мінск…

Па маёй просьбе Ніна перадае віншаванні з Міжнародным днём тэатра чытачам «К». І ў імгненне вока малюе ў маім нататніку фігурку балерыны — «аўтапартрэт»?

— Вы так цудоўна малюеце!

— Мая дачка малюе лепш! Ёй шэсць гадоў, яна займаецца музыкай і малюе. Вельмі любіць дарыць свае работы: «Мамачка, можна, я падару гэта табе?» А праз нейкі час прыходзіць муж, і яна — зноў да мяне: «Мамачка, ты ж не пакрыўдзішся, калі я той малюнак падару цяпер тату?» Потым нечакана прыходзяць госці: «Вы ж з татам не пакрыўдзіцеся, калі я падару ім? Бо намаляваць штосьці новае не паспею…»

— Затое вы, кажуць, паспяваеце і сцэнічныя строі прыдумляць…

— Люблю прыходзіць у тэатральныя майстэрні, памацаць тканіну, паглядзець, як там швачкі працуюць, — і разам мы штосьці прыдумляем. На «Дон Кіхоце» я публіку ўжо так «прывучыла» да таго, што кожны чарговы спектакль танцую ў новым ці хаця б абноўленым, удасканаленым строі, што, баюся, калі раптам давядзецца выйсці ў старым, мяне «не зразумеюць». А цяпер, да 30-годдзя маёй творчай дзейнасці, Тбіліскі тэатр зрабіў мне падарунак: арганізаваў выстаўку касцюмаў, у якіх я танцавала. Разам сабралі 40 касцюмаў розных мастакоў, і зробленыя па маіх эскізах — сярод іх.

— Гэта, пэўна, найлепшы падарунак, які вы калісьці атрымлівалі?

— Не, самы арыгінальны, самы каштоўны для мне — зрабіў муж. Я прачынаюся, а ён мне кажа: «Я дару табе… балет».

— Але ж ён не харэограф і не кампазітар: раней быў дыпламат, а цяпер міністр замежных спраў Грузіі Грыгол Вашадзэ...

— У Фондзе Баланчына ён набыў мне ліцэнзію на пастаноўку «Мацарціяны». Звычайна Фонд супрацоўнічае з тэатрамі, іншымі арганізацыямі, а тут — прадаў правы прыватнай асобе. Бо мяне там ведалі…

— …І ў выніку не сумняваліся. Ігар Артамонаў расказваў, з якой прынцыповасцю там ставяцца да кожнага чарговага пераносу той або іншай пастаноўкі майстра…

— Калі «Мацарціяна» ставілася ў Маскве, са мной працавала знакамітая Сьюзан Фарэл — апошняя каханне Баланчына, на якую і ствараўся гэты спектакль. А ў Грузію ставіць яго прыязджала яшчэ адна балерына баланчынскага перыяду — Марыя Калігары. Гэты балет вельмі мне дарагі! І не толькі з асабістых прычын. Гэта апошняя работа Баланчына, ягоны «рэквіем»: праз два гады пасля пастаноўкі ён памёр. Пачынаецца спектакль з «малітвы», а фінал — светлы і шчаслівы. Для мяне гэта — шлях да святла, нейкая праекцыя на маё асабістае жыццё.

— Ваша жыццё — гэта 30 гадоў у тэатры. Ды не ў драматычным ці оперным, а ў балетным. І заўсёды — у цудоўнай форме, якой і дваццацігадовыя могуць пазайздросціць! Вы і цяпер танцуеце цэнтральныя партыі ў такіх найскладаных класічных балетах, як «Лебядзінае возера», «Жызэль». У чым сакрэт? Гэта пэўная методыка харэаграфічнай падрыхтоўкі, ці прырода-матухна, ці — проста жаночая таямніца?

— Мне часта задаюць падобныя пытанні, але я не ведаю, што на іх адказваць. Мабыць, нешта далі бацькоўскія гены. Можа, і без Госпада не абышлося: проста так падобнага не бывае. Але галоўнае, вядома, — школа, а гэта значыць — дысцыпліна і працаздольнасць. Бо мне і цяпер даводзіцца вельмі шмат працаваць — над сабой, над балетнай формай — і не даваць сабе палёгкі, не ісці на ўступкі. Як толькі ты сабе гэта дазваляеш — усё скончана. Цяжка, вельмі цяжка! Бо ў мяне шмат і іншых нагрузак…

— …Кіраўніцкіх, гаспадарчых, грамадскіх, педагагічных: пад вашай апекай — і падрыхтоўка будучых артыстаў балета…

— Я пачала набіраць дзяцей не з дзесяці гадоў, як гэта прынята ў харэаграфічных вучэльнях, а з шасці — спачатку ў падрыхтоўчую групу. Увяла такую абавязковую дысцыпліну, як акцёрскае майстэрства. Гэта не толькі дапамагае ў танцы, але і дае выбар прафесіі: хтосьці потым ідзе ў дыктары, хтосьці вядзе аўтарскія тэлепраграмы — і расказвае, і танцуе ў прамым эфіры. Але навучэнцаў нашай школы, што ўдзельнічаюць у «Мацарціяне», мы з сабой не бралі. Іх заменяць вашы юныя артысты, якія вучацца ў харэаграфічнай гімназіі-каледжы. Як зарука нашага далейшага сяброўства.

Гутарыла Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Невядомы Лангбард

Архітэктар Іосіф Лангбард надаў Мінску сапраўды сталічнае аблічча. Чатыры будынкі, узведзеныя паводле ягоных праектаў перад вайною — Дом Урада, Оперны тэатр, Акадэмія навук, Дом афіцэраў, — сталі ў архітэктурным сэнсе горадаўтваральнымі. На іх, як на маякі, арыентаваліся наступныя пакаленні, каму давялося будаваць галоўны праспект сталіцы.

Сёлета спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння архітэктара. Прымеркаваная да юбілейнай даты выстаўка адкрыецца ў Нацыянальным мастацкім музеі ў першай палове красавіка. Арганізатары ставяць за мэту прадставіць "невядомага" Лангбарда: у экспазіцыі будзе не толькі творчая спадчына майстра, але яшчэ рэчы і дакументы, якія характарызуюць архітэктара як асобу.

Паводле слоў куратара выстаўкі Валянціны Вайцэхоўскай, Нацыянальны мастацкі музей прадастаўляе для экспазіцыі партрэт архітэктара работы Заіра Азгура. Да арганізацыі спрычыніліся Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, Камітэт па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама, Дзяржаўны музей гісторыі Санкт-Пецярбурга.

Архіў прадставіў праекты Лангбарда (спецыялістам яны вядомыя, шырокаму грамадству — не надта), лісты да калег-архітэктараў і кіраўніцтва БССР, у якіх выказваецца заклапочанасць станам архітэктуры і будаўніцтва ў рэспубліцы; Пецярбургскі музей — дакументы, датычныя часу вучобы архітэктара у Імператарскай Акадэміі мастацтваў і ленінградскага перыяду ягонай творчасці. Акрамя таго, чакаецца, што ў экспазіцыі з'явяцца аўтографы і асабістыя рэчы архітэктара ад ягоных пецярбургскіх сваякоў.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

"Пелапанэс" у Нацыянальнай

23 сакавіка ў рамках святкавання Дня Незалежнасці Грэчаскай Рэспублікі ў атрыуме 2-га паверха Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося ўрачыстае мерапрыемства "Пад небам Грэцыі Свяшчэннай…".

Яго арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка краіны, Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў "Пелапанэс", Пасольства Грэчаскай Рэспублікі ў Расійскай Федэрацыі, якое ажыццяўляе дзейнасць і на тэрыторыі нашай краіны.

Па словах начальніка сацыякультурнага цэнтра НББ Радмілы Букач, у рамках мерапрыемства адбылася прэзентацыя кніжнай выстаўкі. На ёй прадстаўлены кнігі па гісторыі, сацыяльным і культурным жыцці Грэцыі.

Таксама гэтым днём у сценах "Нацыяналкі" распачала працу выстаўка грэчаскага мастака Паўла Дзімітрыядзі, была прадстаўлена экспазіцыя фотаматэрыялаў, у якую ўвайшлі 16 партрэтаў Герояў Нацыянальна-вызваленчага руху Грэцыі (1821 — 1833 гг.).

Напрыканцы мерапрыемства для ўсіх гасцей адбылася святочная канцэртная праграма з удзелам лаўрэатаў Рэспубліканскіх фестываляў нацыянальных культур — ансамбляў "Белыя крылы" (Маладзечна), "Алкесціда" і "Скавыш" (Мінск).

Ю.Ч.

"Небалотныя" людзі, сплеценыя ў "шматпакутнік" навальніцы

Доўгачаканая прэм'ера "Людзей на балоце" ў Купалаўскім тэатры нарэшце адбылася. Што спраўдзілася, а што, можа, не? Бо і спадзяванняў, і сапраўднай тэатральнай інтрыгі, разыгранай па ўсіх законах драматургіі, у падрыхтоўцы гэтага спектакля хапала. А ці хапіла запалу данесці да гледача ўсё, што было задумана?

Раз — логі

Пераклад эпікі ў лірыку, замест калгасных сходаў — любоўны "шматпакутнік"… Усе гэтыя азначэнні, што шчодра ліліся з нетраў тэатра напярэдадні прэм'еры, — не больш як "рэкламная гульня", прызначаная "заманіць" публіку, асабліва — моладзь: школьная праграма, як-ніяк. Бо ў цэнтры спектакля, пры ўсёй вялікай увазе, аддадзенай каханню, апынуўся "логас" — думка. Пра лёс — і асобных герояў (як жа тут без кахання?), і ўсяго народа. Жанр — не меладрама, а трагедыя. Лірычная тэма, пры ўсёй яе значнасці і прыцягальнасці, — толькі "пабочная партыя" ў маштабнай сімфанічнай партытуры. Галоўная ж — лёс зямлі, ад якога залежыць і лёс кожнага. Усё, як і было задумана Іванам Мележам у яго знакамітай трылогіі, два першых рамана з якой леглі ў аснову цяперашняга спектакля.

Увогуле, параўнанне літаратурнай першакрыніцы і наноў зробленай інсцэніроўкі — тэма для асобнага літаратуразнаўчага даследавання. Бо справа зусім не толькі ў тым, што менавіта змянілася. Галоўнае — у які бок. Калі арыгінал папраўдзе таленавіты, дык любая яго перапрацоўка, "пераклад" у іншае жанравае вымярэнне бываюць заведама горшымі. Бо аўтар, пэўна, таксама ўлічвае, які жанр будзе найбольш спрыяльны для абранай тэмы. У таго ж Мележа, акрамя прозы, ёсць і драматургія. Чаму ж ён сам не падумаў пра п'есу? Значыць, было з-за чаго. Тым больш прыемна, што інсцэніроўка, зробленая Аляксандрам Гарцуевым, сапраўды нароўні з арыгіналам (не кажучы ўжо пра ранейшыя тэатральныя кінаверсіі), знешне не прэтэндуючы на моднае "новае прачытанне", вылучаецца вельмі ўдумлівым стаўленнем да аўтарскага тэксту і падтэксту. Перад намі — канцэнтраваны змест раманаў з яшчэ больш ярка выяўленым, чым нават у трылогіі, "словам ад аўтара". Бо ў трылогіі тое "слова" трэба было прыхоўваць, прыкрываючы кідкімі напластаваннямі савецкай эпохі, і не ўсялякі — а хіба самы ўважлівы — чытач мог зразумець сапраўдны сэнс "Палескай хронікі". У яе цэнтры — людзі. Балота ж, вынесенае ў назву, — як сімвал хісткасці, няпэўнасці лёсу: адзін крок "не туды" — і ўсё скончана.

У цяперашняй пастаноўцы героі стаяць на цвёрдай глебе — ніякага павольнага плавання на чоўнах, з любоўю занатаванага ў колішняй кінастужцы. Мінімум антуражу: стол, краты, вясельны пірог (мастак — Ігар Анісенка). Толькі людзі. Паводле сваіх характараў — абсалютна "небалотныя". Наадварот: ледзь не кожны — быццам "інтэлігент у пятым пакаленні". Ніякіх наўмысных, у шырокім сэнсе слова, "лапцей", якімі ў свой час так любілі ўвасабляць сялянскае жыццё на сцэне. Але за кожным героем — тая повязь няспраўджаных мар і надзей, якая і стварае трагедыю ўсяго народа.

Логі — Я

Першае, што кідаецца ў вочы, — гэта тое, з якой адданасцю і шчырай зацікаўленасцю кожны іграе сваю ролю, незалежна ад таго, вялікая яна ці маленькая. Бо ў гэтым спектаклі маленькіх роляў — папросту няма. Кожны, хто з'яўляецца на сцэне, — запамінальны тыпаж, яркі характар, індывідуальнасць. Кожны — вялікая літара "Я".

Тры-логі-я і крыху аналітычнай э-пікі

Таму згаданыя вышэй рэкламныя "абяцанкі" — зусім не "цацанкі". Псіхалогія кожнага "Я" прачытана настолькі дакладна, што спектакль можа лічыцца "вучэбным дапаможнікам", шчодра нашпігаваным "чужымі памылкамі", якія не трэба паўтараць, каб лёс закаханых склаўся шчасліва. Усе — пакутнікі. Усе — заложнікі сваіх амбіцый і характараў, няўмення слухаць ні ўласную душу, ні душу суразмоўцы (не блытаць са словамі, якія могуць падманваць). Ніякага падзелу на "станоўчых" і "адмоўных": у кожнага — сумесь таго і гэтага. І адвечныя шалі: што пераважыць?

Абодва акцёрскія склады — на зайздрасць яркія. І розныя! Рэжысёр настолькі давярае артыстам, што не баіцца часам прапаноўваць ім амаль "оперныя" мізансцэны, калі кожны непарушна стаіць на сваім месцы, і толькі іх думкі ды словы лётаюць туды-сюды.

У мінулым нумары "К" некаторыя ўдзельнікі спектакля ўжо дзяліліся роздумам пра сваіх герояў. А што ж астатнія? Гледзячы на Вацлянціну Гарцуеву (Ганна) і Арцёма Бародзіча (Яўхім), разумееш, што іх героі — роўня адно аднаму. Абодва — лідары, моцныя характарам, здольныя ісці супраць агульнай плыні. Але — адзін не зробіць крок насустрач другому без прымусу. Гледзячы на Аляксандра Паўлава, літаральна скурай адчуваеш, што нават пры самых спрыяльных абставінах яго Васіль, схільны да жыццёвай трываласці, не быў бы шчаслівы з Ганнай, якой "спакой толькі сніцца": надта розныя яны па сваіх памкненнях. У адрозненне ад Глушака з Глушачыхай, якія ў Сяргея Краўчанкі і Тамары Міронавай атрымліваюцца адзінай на спектакль "ідэальнай парай", мудрай і чулай адно да аднаго. А вось Аляксандр Падабед у ролі Чарнушкі — Васіль у будучым: усё разумее, але… маўляў, што я магу зрабіць? Алена Сідарава ў ролі Куліны — фантастыка! Разам з Сарокай (Марынай Гардзіёнак і Юльянай Міхневіч) яны складаюць цудоўнае "жанравае скерца", што разраджае "навальнічную" атмасферу спектакля.

Тры…

Пра "іранічна-злое скерца" гэтага спектакля трэба сказаць асобна. Яго складаюць тры героі — таксама быццам бы індывідуальнасці. Лёша Губаты (Ігар Пятроў) — гэта ж прыроджаны музыкант, які ўмудраецца граць на гармоніку з пашкоджанай, вечна забінтаванай рукой. Мог бы, пэўна, стаць віртуозам, каб не "праклятая вайна". Хоня (Андрэй Дробыш) — такі ж прыроджаны комік, але ўваходзіць у ролю "памагатага пры начальстве", не забываючыся на "вадкі ганарар". Міканор (Павел Астравух і, у другім складзе, Павел Яскевіч) — прыроджаны барацьбіт "за справядлівасць", які блытае яе з калектывізацыяй і мае за жонку рэвалюцыю. Гэта "тройца", вылучаная з рамана і сплеценая ў "калектыўны вобраз" новай улады, — з аднаго боку, пародыя на Святую Тройцу, а з іншага — асацыятыўны правобраз "троек", якія дзейнічалі ў часы сталінскіх рэпрэсій. Усё быццам бы нават смешна, Міканор увогуле "белы ды пухнаты", бо выпускае Васіля з астрога. Але ўсё гэта — быццам знакамітая "тэма нашэсця" з распрацоўкі першай часткі "Ленінградскай" сімфоніі Д.Шастаковіча: "лялечна-батлейкавыя" выступленні незаўважна і вельмі хутка ператвараюцца ў машыну, што знішчае ўсё на сваім шляху.

І-і-і… Раз-два-тры, раз…

Ключ да музычнага афармлення спектакля закладзены ўжо ў інсцэніроўцы. Выводзячы на авансцэну ў пачатку спектакля "музычнае трыа" і агучваючы яго "жаласным рамансам" і "Маршам будзёнаўцаў", а фінал ператвараючы ў сенакос з народна-песеннай аўтэнтыкай, Аляксандр Гарцуеў дакладна расстаўляе ўсе акцэнты. Вось яна, канцэпцыя ўсяго спектакля, выкладзеная на музычнай мове! Застаецца дадаць хіба любоўны струмень. І ад таго, якім ён будзе — любоўным кантам, працяглай лірычнай баладай, "жорсткім рамансам", прыпеўкамі, — залежыць агульны расклад і жанравая акрэсленасць усёй дзеі. А нам прапануюць электроніку — то "фонавую", то "псеўдафальклорную". Гэтыя "ўкрапванні" ўспрымаюцца штучнымі плямамі-кляксамі. А між тым, у сваёй мінулай аўтарскай рабоце — спектаклі "Не мой" з музыкай Алега Хадоскі — Гарцуеў дасягнуў такой неабходнай для тэатральнага мастацтва гармоніі складнікаў. Калі, нарэшце, мы ўвогуле пачнём гаварыць не пра "музычнае афармленне", а пра цэласную фанасферу спектакля? Тую, куды на роўных уваходзяць усе элементы гукавой сцэнічнай прасторы: маўленне (а ў спектаклі з любоўю перададзены асаблівасці адметнай палескай гаворкі), інтанацыйнасць і сам тэмбр акцёрскіх галасоў, фоны-шамаценні-гоманы, грукі-стукі, нават шорганні нагамі — і, вядома, уласна музыка як яшчэ адно выяўленне агульнай канцэпцыі, гэткае "слыхавое ўдакладненне" аўтарскай задумы…

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Літаральна ў мінулым нумары на старонках "К" мы разважалі пра тое, як зрабіць працэс стымулявання творчасці маладых драматургаў больш матываваным. І вось — прыемны сюрпрыз: Цэнтр беларускай драматургіі і рэжысуры абвяшчае драматургічную он-лайн-лабараторыю па стварэнні новых п'ес.

Он-лайн-версія для драматургаў

"Экстрым" — з панядзелка

Дзясятка — на лабараторным старце

Сутнасць лабараторыі: цягам адведзеных шасці тыдняў кожны з аўтараў-удзельнікаў павінен напісаць новую п'есу або сцэнарый. Не сакрэт, што шмат хто з аўтараў, асабліва — маладых, з самых розных, часта даволі аб'ектыўных, прычын значную частку сваіх ідэй не даводзіць да канчатковай рэалізацыі таму, што не можа "сабрацца" і "арганізаваць" творчую работу. Акурат гэтым і закліканы заняцца куратар праекта — драматург Дзмітрый Багаслаўскі.

Удзел у лабараторыі было прапанавана прыняць усім ахвотным. Даступнасць не толькі для сталічных аўтараў, а і для жыхароў з любога куточка нашай краіны забяспечвае тое, што для творчага старту неабходна зарэгістравацца праз Інтэрнэт і ўвайсці ў афіцыйную суполку он-лайн-лабараторыі. І, як аказалася на зайздрасць тым, хто адмаўляе творчую актыўнасць маладых драматургаў, ахвотных уступіць у творчае спаборніцтва сабралася цэлая дзясятка. Прычым сярод тых, хто стартуе, — як "чыстыя" пачаткоўцы, так і аўтары, імёны якіх ужо "засвечаны" на тэатральных сцэнах, у тым ліку — і на беларускіх.

Галоўная ўмова творчага спаборніцтва — адна: адказна і рэгулярна кожны тыдзень выкладваць чарговую частку будучага твора так, каб праз шэсць тыдняў выйсці на "фініш" і — стаць уладальнікамі цэлага стосу па-сапраўднаму свежых, жывых тэкстаў. Іншыя абмежаванні — жанравыя альбо тэматычныя — не дзейнічаюць. Ну а вынікам для тых, хто дойдзе да фінішу і створыць самыя цікавыя тэксты, стане іх прэзентацыя ў выглядзе сцэнічных чытанняў у рамках Цэнтра на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Яшчэ адной адметнасцю драматургічнай он-лайн-лабараторыі з'яўляецца тое, што не толькі канчатковы вынік — гатовая п'еса, але і сам працэс стварэння апошняй будзе ажыццяўляцца максімальна адкрыта для дыскусій ды абмеркаванняў. На любым этапе напісання твораў на старонцы кожнага з драматургаў-удзельнікаў будзе адкрытая магчымасць каментарыяў да ўжо зробленага. Аднак такі дадатковы "экстрым" для ўдзельнікаў лабараторыі, загартоўваючы іх творчы характар, можа стацца і важнай рэччу, якой часта вельмі не хапае любому аўтару: жывой камунікацыяй, што дазваляе правяраць уласныя знаходкі, здагадкі і не "варыцца" ва ўласным соку.

Ужо ў бліжэйшы панядзелак, 26 сакавіка, з'явяцца першыя часткі будучых п'ес. Ну а ў апошніх чыслах красавіка чакаем "апошнюю кропку". Ці, дакладней, шматкроп'е, якое, без перабольшання, дасць нам падставы для гаворкі пра эфектыўнасць творчых тэхналогій па стварэнні актуальнай беларускай драматургіі.

Таццяна КОМАНАВА

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" распачала здымкі новага тэлевізійнага мастацкага праекта з назвай "Ой, ма-ма-чкі!". Двухсерыйная стужка апавядае пра жыццё супрацоўнікаў і пацыентаў аддзялення паталогіі радзільнага дома. Як сцвярджаюць аўтары, карціна, што змяшчае мноства рэальных і прыдуманых сітуацый, мае аказацца ўнікальнай у сваім родзе.

Раскадроўка

"Ой, ма-ма-чкі!" па-беларуску

Сцэнарый фільма напісалі Людміла Перагудава і Юлія Ляшко. Апошняя вядомая па тэлевізійных карцінах "Сяброўка восень", "Міксер і Елачка", "Рыфмуецца з каханнем" ды іншых меладрамах. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам праекта выступае Іван Паўлаў, які апошнім часам спецыялізуецца менавіта на тэлевізійных карцінах. Здымкі стужкі праходзяць у лячэбных установах сталіцы, у тым ліку — у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры "Маці і дзіця". У кадр аператара фільма Вячаслава Дунаева таксама трапяць Нацыянальны аэрапорт "Мінск", Палац спорту, а інтэр'еры бальнічнай палаты будуць пабудаваны ў павільёнах Нацыянальнай кінастудыі.

Галоўную ролю ў карціне — загадчыка аддзялення паталогіі Веры Міхайлаўны — выконвае актрыса тэатра і кіно Вера Палякова. У астатніх ролях задзейнічаны не толькі беларускія артысты, сярод якіх можна назваць Кацярыну Шатрову, Святлану Зелянкоўскую, Ігара Сігова, Алесю Пухавую, Ганну Казючыц, але і вядомыя замежныя акцёры (прозвішчы іх пакуль трымаюцца ў таямніцы). Праект "Ой, ма-ма-чкі!" "Беларусьфільм" стварае сумесна з расійскімі партнёрамі. Чакаецца, што здымачны перыяд стужкі будзе завершаны да 2 мая, а ў другой палове бягучага года яна будзе гатова да выхаду на тэлеэкраны.

С.А.

На здымках: Вера Палякова і Ігар Сігоў; Святлана Бароўская, Аляксандр Паўлаў і Алеся Пухавая на здымачнай пляцоўцы. Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Бамонд: опера, балет

Адкрыты пяць гадоў таму Маладзечанскі маладзёжны музычны народны тэатр на чале з Рыгорам Сарокам падрыхтаваў чарговую прэм'еру: оперу Ж.Бізэ "Кармэн". Гэтым разам — у канцэртным выкананні, у адрозненне ад пастаўленых раней "Іяланты", "Яўгенія Анегіна" П.Чайкоўскага і "Травіяты" Дж.Вердзі.

Шкляная ружа — эмблема самоты?

Калі Хазэ сустрэў Кармэн у... віртуалцы

Канцэртныя і напаўканцэртныя версіі сёння распаўсюджаны ў свеце — як і шматлікія пастаноўкі ў так званым чорным кабінеце, калі сцэна ўяўляе з сябе гэткі "чорны квадрат". Падобныя варыянты бываюць выкліканы жаданнем не толькі эканоміць сродкі, але і скіраваць увагу публікі ўласна на музычны матэрыял.

Музычны складнік не падвёў маладзечанцаў. І гэта пры тым, што збегам абставін былі скарыстаны амаль адно "ўнутраныя рэзервы". Спачатку разлічвалі, што хаця б у адным з двух паказаў спяваць будуць былыя выхаванцы тамтэйшага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага — сёння ўжо запатрабаваныя Анатоль Сіўко, які працягвае навучанне ў Маладзечанскім філіяле БДАМ, і саліст тэатра Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі Уладзімір Дзмітрук. Але тое, што тэатр, кожны год змяняючы склад (навучальны працэс, як-ніяк), не разлічвае адно на запрошаныя кадры, дадаткова сведчыць пра яго трываласць.

— Уразіў ужо сам узровень падрыхтоўкі ўдзельнікаў, — заўважыў заслужаны артыст Беларусі, прафесар Уладзімір Будкевіч, які пабываў на прэм'еры. — Я шмат гадоў працаваў у нашым Вялікім тэатры і добра ведаю ўсе праблемныя па выкананні моманты гэтай оперы. Але аркестравыя сола, якія, здараецца, не ўдаюцца прафесіяналам, тут гучалі без заган. А вакалісты так вывучылі ўласныя партыі, што ім не трэба было сачыць за дырыжорскай палачкай…

Піетэтнае стаўленне да свайго тэатра ўласцівае і маладзечанскай публіцы. Кожны спектакль справядліва ўспрымаецца як суперпадзея і суправаджаецца адпаведным антуражам. За гадзіну да прэм'еры ў зімовым садзе Палаца культуры была адкрыта выстаўка Ядвігі Сянько — адначасова з яшчэ адной прэзентацыяй ейнай творчасці ў Ерэване. Пунсовыя кветкі ў валасах, спалучэнне чорнага з чырванню вылучалі не толькі ўдзельнікаў спектакля (менавіта так быў апрануты хор), але і іхніх прыхільнікаў. Многія гледачы таксама прыходзілі "ў вобразе", адпаведным прэм'еры. Настройваў і дызайн афіш, праграмак, запрашальнікаў, выкананы мастакамі Палаца Святланай Сярогінай і Таццянай Туроўскай. На адценнях чырвонага — ружа з пачарнелымі пялёсткамі. Празрыстая, быццам шкляная — далікатна-крохкая. Такая ж ружа, намаляваная на палотнішчы, спускалася з каласнікоў сцэны ў час смерці гераіні.

І ўсё б добра, але сцэнічная Кармэн не адпавядала гэтаму сімвалу. Яна папросту была іншай! Не столькі ракавая прыгажуня, колькі трагічная постаць. Гэтую партыю ў якасці дзяржаўнага іспыту выканала Марына Змітровіч — пяцікурсніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе народнай артысткі краіны Наталлі Рудневай, прынятая ў стажорскую групу Нацыянальнай оперы. Іншым атрымаўся і Хасэ (Андрэй Мацюшонак, трэцякурснік каледжа па класе Георгія Юрэвіча): не помслівы халерык з упартасцю флегматыка, а меланхалічны прызыўнік, яшчэ амаль дзіця, што трапляе ў вір жыццёвых рэальнасцей пасля апекі маці і яе жаночага атачэння, сярод якога — Мікаэла (лаўрэат міжнародных конкурсаў, выкладчыца каледжа Наталля Францкевіч). Тая, зноў-такі, не падлетак з комплексам "правільнай" дзяўчынкі-выратавальніцы", а мяккая, угэўненая маладая жанчына з тым матчыным стаўленнем да хлопца, што не дазваляе ёй перайсці межы пацалунка ў шчаку.

Здавалася б, такі нетрывіяльны расклад партый, дзе адно Эскамільё (Андрэй Саўчанка, чацвёртакурснік Маладзечанскага філіяла БДАМ па класе таго ж Юрэвіча) адпавядае традыцыям, — знаходка для рэжысёрскай канцэпцыі і далейшых фантазій. А канцэртнае выкананне — дадатковы стымул для псіхалагічных пошукаў. Але… Кармэн і Хасэ ўпершыню сустрэліся на сцэне толькі ў фінале. Скажаце, купюры вінаваты? Так, скарочанымі аказаліся не толькі дыялогі, але і многія сцэны. Атрымалася штосьці накшталт канцэрта, складзенага з нумароў адной оперы. Элементамі сцэнічнага дзеяння былі прасякнуты хіба паядынак Хасэ і Эскамільё, сцэны варажбы ды смерці. Сучасныя ж тэндэнцыі — у тэатралізацыі нават звыклых філарманічных канцэртаў, калі асобныя нумары яднаюцца адзінай лініяй развіцця.

Пэўна, у мяне надта высокія меркі да вучняў і настаўнікаў каледжа? Яны і так пераўзыходзяць усе магчымыя планкі. Вольга Гардзей (Мерсэдэс) — выкладчык па класе… цымбалаў, а спявае ў дуэце не горш за спрактыкаваную выкладчыцу хору Вольгу Кохан (Фраскіта), хіба што тэмбр не такі багаты. Хор з аркестрам — фантастыка! А якія велізарныя перспектывы ў Андрэя Мацюшонка! Кажуць, на яго ж курсе ёсць яшчэ адзін адораны тэнар. У канцэртным жа выкананні партыю можна падзяліць "на дваіх" ды яшчэ абгрунтаваць неадназначнасцю персанажа, у якім быццам змагаюцца два чалавекі. І ад мікрафоннай падгучкі, сапсаванай гукарэжысурай, можна адмовіцца — пры вынаходлівай расстаноўцы артыстаў. Што ж перашкаджае рэжысёрскаму палёту думак? Гэты складнік, дарэчы, заўсёды быў "слабым месцам" Маладзечанскага тэатра. Значыць, трэба не вымушаць спевакоў бяздумна мераць сцэну крокамі ды пыліць спадніцамі, імітуючы "сцэнічны рух", а — шукаць. Асабліва да наступнай прэм'еры.

Як, вы яшчэ не ведаеце? Дык рыхтуйцеся, шаноўныя чытачы: вывучайце жыццё і творчасць Міхала Клеафаса Агінскага і шыйце сабе бальныя строі. Акурат праз год у Маладзечне — прэм'ера беларускамоўнай оперы, прысвечанай нашаму вялікаму суайчыннику. Яе тэатр замовіў вядомым беларускім творцам — кампазітару Алегу Залётневу і лібрэтысту Сяргею Макарэю. Праца кіпіць!

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота Паўла ЦЫБІНА

На здымку: сцэна са спектакля.

Сваю б п'есу ў Шарлевіль...

Тэатральная плошча

21 сакавіка — Сусветны дзень лялечніка. Якімі клопатамі жывуць сёння сем лялечных тэатраў рэспублікі, "К" распытала дырэктара — мастацкага кіраўніка Брэсцкага тэатра лялек і кіраўніка Беларускага цэнтра міжнароднага саюза дзеячаў тэатраў лялек (UNIMA) Міхаіла Шавеля.

Сцэна са спектакля Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек "Драй швэстэрн" (лаўрэата І Нацыянальнай тэатральнай прэміі).

Як распавядае Міхаіл Шавель, рэалізуецца Праграма рэканструкцыі і тэхнічнага пераабсталявання дзяржаўных тэатраў на 2004 — 2013 гады. Неадрамантаванымі засталіся толькі Гродзенскі і Брэсцкі лялечныя тэатры. У першай установе рэканструкцыя ўжо вядзецца поўным ходам, у другой — работы нядаўна распачаліся. Але, напэўна, галоўным у творчай эвалюцыі "лялечнай" справы з'яўляецца не толькі ўмацаванне матэрыяльнай базы…

— Мы дынамічна развіваемся, мы — канкурэнтаздольныя ў еўрапейскай прасторы, — адзначае Міхаіл Шавель.

Сапраўды, міжнародная дзейнасць нашых лялечнікаў — больш чым унушальная. Штогод тэатры бяруць удзел у дваццаці-трыццаці фестывалях. Брэсцкія артысты і іх лялькі ўдзельнічалі, да прыкладу, у чатырох міжнародных фэстах, у тым ліку ў Сусветным фестывалі лялечных тэатраў у французскім Шарлевіль-Мезьеры, куды з'ехаліся 253 калектывы з усіх кантынентаў. А на XV Сусветным фестывалі тэатраў лялек у Празе брэсцчане апрача Гран-пры атрымалі ўзнагароды за рэжысуру, сцэнаграфію і музыку. Па рашэнні Савета UNIMA вядучаму майстру сцэны Брэсцкага тэатра лялек, заслужанай артыстцы Беларусі Тамары Тэвасян уручаны прыз і Прэмія Анатоля Ляўскага…

Але святочны тыдзень не адмяніў "лялечных" праблем. Міхаіл Шавель перакананы, да прыкладу, што гастрольная дзейнасць у межах краіны патрабуе неадкладнай актывізацыі. А ў беларускім рэпертуары мала арыгінальных п'ес — даводзіцца займацца перакладамі замежных твораў.

А.С.

Сцэна са спектакля Брэсцкага тэатра лялек "Месяц Сальеры".

Мастыхін



Сяо Юй. "Вечная прыгажосць гор Хуаншань".

Гук кропель дажджу, што падаюць

"Жывапіс ідэі" і мяжы Сяо Юя

Нацыянальны мастацкі музей прымае выстаўку твораў вядомага кітайскага жывапісца Сяо Юя "Зачараванне Усхода", прымеркаваную да 20-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай. У экспазіцыі канферэнц-залы і вестыбюля размясцілася 26 работ мастака, выкананых у старадаўняй тэхніцы жывапісу "гохуа" тушшу і мінеральнымі фарбамі.

Сяо Юй. "Гук кропель дажджу, што падаюць".

Як вядома, самымі распаўсюджанымі жанрамі кітайскага жывапісу, як і ў глыбокай старажытнасці, з'яўляюцца пейзаж (шань-шуй) і "кветкі-птушкі" (хуаняа), дзе, як у люстэрку, адбіваецца шчырая любоў народа да адвечнай прыроды.

Ідэя гарманічнага яднання чалавека з трапятліва-цудоўнай прыродай стала не толькі душой кітайскага мастацтва, але і сэнсам спазнання сусветнага быцця эстэтыкі і філасофіі.

Калісьці ў Пекіне я ўбачыў выстаўку кітайскага жывапісу, дзе ўпершыню пазнаёміўся з так званым стылем сеі (жывапіс на паперы і шоўку), назву якога можна перакласці як "жывапіс ідэі". Мне распавялі, што гэты стыль — стыль "грубага пэндзля" (у адрозненне ад стылю "гунбі" — "акуратны", "старанны пэндзаль") — своеасаблівая асацыятыўная імправізацыя. Яе нельга скапіраваць ды іміціраваць. Гэта значыць, сеі — жывы дух, вобраз і хараство аб'екта: хуткі малюнак, шырокія мазкі, свабода адлюстравання.

І ўсё тое ёсць у творчасці Сяо Юя. Калі я наведваў выстаўку, узгадаў выслоўе вялікага Цы Байшы, які казаў: прызначэнне жывапісу ў тым, каб знайсці мяжу паміж падабенствам і непадабенствам. Абсалютнае падабенства — банальнасць, а відавочнае непадабенства — скажэнне рэчаіснасці. Дык вось, жывапіс Сяо Юя якраз — на такой мяжы. Паглядзіце яго творы "Вечная прыгажосць гор Хуаншань" (гэта любімыя мясціны мастакоў у правінцыі Аньхай, што на ўсходзе Кітая), "Вясна на поўдні", "Лотас над чыстай вадой", "Водар лотаса ў сне", "Надзея на будучыню", "Чатырохрадкоўе" або "Гук кропель дажджу, што падаюць", каб адчуць галоўны "нерв" мастака, звязаны з яго шчырай любоўю да роднай прыроды, якая пад пэндзлем ператвараецца ў манументальную алегорыю душэўнай высакароднасці, у сімвал спрадвечнай сувязі зямлі, неба і чалавека.

Сёлета Сяо Юю спаўняецца 50 гадоў. Ён займае пасады намесніка сакратара Саюза мастакоў Ханьданскага раёна правінцыі Хэбэй і намесніка дырэктара Ханьданскага мастацкага інстытута. Два гады таму ён стаў лаўрэатам прэміі "Лепшае дасягненне ў кітайскай культуры і мастацтве". У Мінск Сяо Юй прыехаў упершыню, але мы, беларускія гледачы, спадзяёмся, што гэты творчы візіт мастака — не апошні.

Барыс КРЭПАК

Нулявыя на "Гарызонце"

Мастацкі "лофт" дзесяцігоддзя

Фота Вольгі ШУКАЙЛА

Куратары выстаўкі беларускага сучаснага мастацтва "Радыус нуля" паставілі перад сабой амбітную мэту: падвесці вынікі мінулага дзесяцігоддзя. Зважаючы на тое, што ці не асноўнымі характарыстыкамі арт-асяроддзя за справаздачны перыяд былі яго інтравертнасць, дыскрэтнасць і падзеленасць агульнага поля на розныя "паляны", падобныя памкненні выклікаюць асацыяцыі з вядомай арыфметычнай аперацыяй множання на нуль. Але больш істотна тое, што "на выхадзе" атрымаўся не занудлівы даследчыцкі праект, разлічаны на адзінкі "далучаных", а прыстойны прадукт, які засведчыў камунікатыўныя магчымасці сучаснага мастацтва ды цікавасць публікі да гэтай з'явы.

У якасці экспазіцыйнай пляцоўкі быў абраны колішні цэх мінскага завода "Гарызонт". Яго арыгінальны і "непрычасаны" інтэр'ер стаў цудоўным атачэннем для саміх твораў. Таму хочацца верыць, што актуальная ва ўсім свеце мода на "арт-лофт" дасца ў знакі і ў нас.

Патэнцыял і спецыфічны шарм гэтай прасторы ці не лепш за ўсіх удалося рэалізаваць Арцёму Рыбчынскаму, які ўжо не ўпершыню выкарыстаў звычайны калідор у якасці калідора метафарычнага. Тэлевізар як крыніца святла, пару люстэркаў, што яго тыражуюць, спараджаючы адвольныя гульні, цемра, прастора — вось, у прынцыпе, і ўсё, што трэба для стварэння адметнага твора, але... Апошнюю інсталяцыю гэтага мастака даводзілася бачыць гадоў -наццаць таму: акурат з прасторай у нас і праблема.

Паслядоўны канцэптуаліст Ігар Саўчанка выставіў сонечнае святло, пра што паведаміў на прыклееным да акна "цэтліку". Рэанімаваны спецыяльна для гэтай выстаўкі "Буцік" Артура Клінава лішні раз засведчыў здольнасць сучаснага мастацтва прымаць самыя нечаканыя формы: гледачы маглі лёгка збліцаць арт-праект з крамай, ці, дакладней, лаўкай старызніка. Майстар дэканструктывісцкага дызайну Уладзімір Цэслер гэтым разам "падняў руку" на галоўную "ікону" авангардызму: "Чорны квадрат" быў ператвораны ў магніцік, якія звычайна чапляюць на дзверку лядоўні. Руслан Вашкевіч, які, дарэчы, выступіў адным з сакуратараў выстаўкі, спалучыў рэнесансавыя інтэр'еры і гульнёвы жанр "экшн".

І ў выніку атрымалася, на маю думку, ці не самая пераканаўчая дэманстрацыя беларускага сучаснага мастацтва за гады яго існавання. Варта адзначыць, што айчынныя куратары справіліся з гэтай задачай лепш, чым іх вядомыя замежныя калегі. Бо толькі беларусы здатныя больш-менш адэкватна ўсведамляць грамадскі і культурны кантэкст, пазбаўляючыся зусім недарэчных у такой справе стэрэатыпаў.

Ілья СВІРЫН

Камертон

Амана без падману

Рускія рамансы ў японскім кімано ды з беларускім аркестрам? Менавіта такі канцэрт правёў аркестр народных інструментаў імя Л.Іванова Магілёўскай абласной філармоніі. Саліравала — Каёка Амана.

Японская спявачка, якая ў свой час стажыравалася ў Маскоўскай кансерваторыі, даўно займела імідж адной з лепшых выканальніц рускага раманса. Як жа ўзнікла сяброўства з беларускім калектывам?

— Нас пазнаёміў, — распавёў мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор аркестра Мікалай Алданаў, — расійскі музыкант Аляксандр Цыганкоў, з якім наш калектыў супрацоўнічае ўжо многа гадоў. І пасля чарговых выступленняў у Санкт-Пецярбургу Каёка завітала да нас. Гэта ўнікальная вакалістка! Справа не толькі ў яе музычнай адоранасці, выразным мецца-сапрана, але і ў тым, наколькі тонка яна разумее славянскую душу, як даносіць сэнс кожнай фразы, кожнага слова. Вы б толькі бачылі, як яе прымала публіка! Напрыканцы канцэрта, адышоўшы ад рамансаў, яна праспявала "Кацюшу" — па-руску і па-японску. Дый на рэпетыцыях перакладчык нам быў не патрэбны: яна цудоўна размаўляе па-руску. І пакінула наступны запіс у кнізе водгукаў: "Вельмі рада быць у вашым горадзе і выступаць з аркестрам такога ўзроўню. Мару і спадзяюся супрацоўнічаць з вамі надалей. У вас цудоўны дырыжор, выдатная тэхніка ігры, пачуццё стылю". Сапраўды, наша творчае сяброўства з Каёка Амана працягнецца. І ў час яе наступных расійскіх гастролей мы правядзём сумесны канцэрт у Мінску. Ёсць і задума падрыхтаваць з нашым аркестрам цыкл японскіх песень.

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымку: Каёка Амана саліруе ў суправаджэнні Аркестра народных інструментаў на магілёўскай сцэне.

Вясна як рэтра?

"Вясна ідзе..." — гэтай рахманінаўскай назвай пазначаны канцэрт папулярнай кінамузыкі, падрыхтаваны салістамі і ансамблем "Рэтрахіт" Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

— Усе гэтыя песні, — распавяла напярэдадні падзеі аўтар праекта, кампазітар Валянціна Сярых, — я чула ў дзяцінстве. Здавалася б, ведала ў іх кожную ноту. Але толькі цяпер, калі пачала працаваць над праграмай і рабіць свае аранжыроўкі, змагла ў поўнай меры ацаніць, колькі ўкладзена ў тыя песні таленту, энергетыкі і нейкай асаблівай чысціні — што ў мелодыю, што ў словы. Як кампазітар адбірала я даволі строга. Не ўсялякая песня можа годна прагучаць у філарманічным асяроддзі, ды яшчэ ў Камернай зале імя Рыгора Шырмы. Тут усё на вачах! Не "схаваешся" ні за электроніку, якой гэтая сцэна не выносіць, ні за знешнія аксесуары. Таму спынялася на тых кампазіцыях, дзе абсалютна ўсё на сваім месцы: кожная інтанацыя, гармонія — усё жыве і дыхае. Быццам бы проста, ды не трывіяльна, з фантазіяй і, галоўнае, — ад усяго сэрца. А з якім захапленнем узяўся за гэтую працу наш ансамбль і маладыя салісты нашай Філармоніі для дзяцей і юнацтва! Спевакі Святлана Старадзетка, Тамара Рэмез, Святлана Еўнух, Улад Даніловіч, дамрыстка Наталля Змітровіч — кожны зрабіў свой унёсак. Той жа Ігар Задарожны ў нашай праграме і спявае, і на саксафоне саліруе, і чачотку адбівае. Адгукнуліся гасцявыя калектывы — той жа дзіцячы хор Белтэлерадыёкампаніі, вайскоўцы. Яны таксама наноў адкрывалі для сябе прыгажосць і адметнасць рэтра-мелодый… Няма чаго здзіўляцца, што білеты разышліся імгненна.

Дадамо, што свой уклад у папулярызацыю "старых песень пра галоўнае" штогод уносіць і Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі на чале з народным артыстам краіны, прафесарам Міхаілам Фінбергам. Чарговы фестываль гэтага калектыву "Шлягеры на ўсе часы" пройдзе ў філармоніі 26 — 29 сакавіка. Менавіта дзякуючы яму "рэтра" цяпер асацыіруецца не толькі з настальгічнай восенню, але і з яркай, сонечнай вясной.

Н.Б.

На здымку: Валянціна Сярых у "рэтра-вобразе".

Харэаграфія мінулым тыднем апынулася ў цэнтры ўвагі дзеячаў культуры і ўсіх зацікаўленых. Тут і калегія Міністэрства культуры, прысвечаная, у тым ліку, яе праблемам, і, акурат праз тры дні, "Фэст эстраднага танца", што сабраў калектывы з розных куткоў Беларусі ў Маладзёжным тэатры эстрады. Яго вынікі, дарэчы, былі настолькі непрадказальнымі, што абмеркаванне за "круглым сталом" і ў кулуарах доўжылася ледзь не да поўначы. Хаця... "Пра што тут спрачацца?" — запытаюць тыя, хто ўсё яшчэ думае, што эстрадныя танцы — гэта адно праславутая "падтанцоўка" за спінамі "зорак". Насамрэч, названая з'ява — куды больш шырокая. І пытанняў тут узнікае — процьма.

Куды павінен рухацца эстрадны танец? У масы, на дыскатэку ці — у бок "высокага мастацтва"? І што ў ім галоўнае? Эмоцыі, трукі, энергетыка, рухі? Ці, можа, сюжэт? А дзе ўсяму гэтаму навучыцца? І ў каго? Нарэшце, наколькі нашы танцавальныя па на эстрадзе адпавядаюць сусветным кірункам?

Пытанні можна працягваць да бясконцасці. Паспрабуем разабрацца.

Харэаграфія пачынаецца на месцах

Ці сапраўды сышоў глядач з танцавальнага "рынку збыту" краіны?

Дык вось ты які, эстрадны танец!

— У мяне склалася ўражанне, — кажа прадзюсар Уладзімір Кубышкін, — што гэтая галіна знаходзіцца на этапе стагнацыі. Эстрадны танец ледзь не цалкам (калі, зразумела, ахопліваць яго айсберг агулам, а не адно толькі вяршыню) трымаецца на энтузіязме. Для аматарскага ўзроўню — нармальна, нават "прыкольна". Але, прабачце, за грошы я б гэта не прыдбаў — кажу вам як прадзюсар. Бо павінна быць высакаякаснае шоу з добрымі, арыгінальнымі касцюмамі. І галоўнае — з новымі ідэямі. Танцаваць на эстрадзе трэба — модна! Артыстычна, стыльна, з сучаснымі рухамі, а не ў духу мінулых дзесяцігоддзяў. Важна ўсё: фігура, фактура, рост. У тым жа балеце, які суправаджае эстрадных спевакоў, запатрабаваны танцоўшчыкі з рознымі прыроднымі данымі. Камусьці патрэбны невысокія артысты, камусьці — пад два метры. Бо разам з салістам яны павінны глядзецца гарманічна, прыгожа, эстэтычна. Давайце, нарэшце, сур'ёзна ставіцца да эстраднай харэаграфіі! Тыя спевакі, якія гэта зразумелі, — на вышыні…

З такой "ансамблевай" функцыяй эстраднага балета згодны не ўсе. Вядома, ён не можа вычэрпвацца адно падтанцоўкамі! Але ж у чым выйсце?

— Эстрадны танец, у адрозненне ад сучаснай харэаграфіі, — мяркуе адна з заснавальніц гэтага кірунку ў Беларусі Людміла Яфрэмава, — павінен быць сюжэтным. Сышоў з эстрады сюжэт — сышоў і глядач...

З такім пунктам гледжання можна, вядома, і не пагадзіцца. Сапраўды, чаму трэба прымусова вяртаць танец у межы адно харэадрамы — пераказу літаратурнага сюжэта? Няўжо танец усё яшчэ "не дарос" да таго ўзроўню самастойнасці, калі яго каштоўнасць будзе вымярацца ўласна харэаграфіяй — энергетыкай, прыгажосцю, пластычнасцю ці, наадварот, графічнасцю рухаў?

— Справа не ў сюжэце, — разважае чэмпіёнка свету па ўсходнім танцы і фламенка Алена Грынчык, больш вядомая пад псеўданімам Ясмін, — а ў тым, каб было цікава. Каб гэта было прыгожа, эстэтычна. Каб хацелася глядзець!..

Але ці праводзіў хто маніторынг, якія танцы хоча бачыць публіка? І ці праўда, што яна заўсёды мае рацыю?..

Мадэрн — "руліць"

На "Фэсце эстраднага танца", дарэчы, журы вызначала пераможцаў не па месцах (першае, другое, трэцяе), а па творчых намінацыях. Уладальніка ж Гран-пры вызначылі па выніках галасавання, што адбывалася ў зале: на ўваходзе гледачы атрымлівалі спіс удзельнікаў, а потым здавалі яго з пазначаным лепшым нумарам. Хто, вы думалі б, перамог? Віцебская студыя "Паралелі", схільная да мадэрна і зусім не эстрадная — у агульнапрынятым сэнсе гэтага слова.

— Тэлебачанне здольнае вельмі хутка зрушыць сітуацыю з мёртвай кропкі. Калі ў самы рэйтынгавы час на экранах у поўным сэнсе слова "танцуюць усе", дык і глядач хоча займацца тым жа. У нас жа пакуль менш развіты, калі можна так сказаць, "рынак збыту". Падобны тэлеконкурс таксама ў свой час праводзіўся, але ён не набыў таго размаху і маштабнасці. Кожны з тых, хто займаецца эстрадным танцам, існуе сам па сабе. І не заўсёды цікавіцца тым, што адбываецца навокал. Інфармацыі ж сёння — мора. У тым ліку — дзякуючы Інтэрнэту. Але ж ці ўсе ёй цікавяцца? Ці ўсе імкнуцца яе неяк асэнсаваць і пераасэнсаваць? Здараецца, проста "пазычаюць". Але плагіят і творчае развіццё ідэі — рэчы прынцыпова розныя. Назіраючы за тым, як працуюць некаторыя гурты, можна заўважыць адсутнасць цікавай, арыгінальнай лексікі, немузычнасць у пастаноўках: музыка — змянілася, а яны працягваюць танцаваць, быццам нічога не здарылася. Ці наадварот: музыка паўтараецца, а танцоры гэтага быццам не заўважаюць. Так бывае, калі танец ставіцца "адасоблена", нібы сам па сабе, таму і спалучаецца хіба з рытмам, а не з формай. Але ж важна ўсё — у комплексе!..

Уменне рухацца набывае ў галіне харэаграфіі дадатковы сэнс. І наўпрост звязана з тым кірункам, у якім збіраюцца (ці, можа, не збіраюцца ўвогуле) рухацца артысты.

Сёння многія з настальгіяй узгадваюць, як яшчэ дзясятак гадоў таму пачатковае харэаграфічнае навучанне існавала ледзь не ў кожнай агульнаадукацыйнай школе. А цяпер многія думаюць, што эстрадныя танцы — гэта адно праславутая "падтанцоўка" за спінамі "зорак". Насамрэч, названая з'ява — куды больш шырокая. І пытанняў па яе развіцці ўзнікае — процьма...

Можа, таму, што яны прадставілі ажно чатыры нумары? І перамаглі, такім чынам, па колькасці. Ці таму, што ў іх выступленні мінская публіка ўбачыла штосьці для сябе новае, незвычайнае — у параўнанні з тым, што яна бачыць звычайна? Напярэдадні ж былі перасцярогі, а ці зразумеюць іх у эстрадным атачэнні ўвогуле?

Але публіка свой выбар зрабіла. І аказалася зусім не адзінокай на фоне глядацкіх аўдыторый нашых суседзяў. Не толькі ў Польшчы ды іншых заходніх краінах, але і ў той жа Украіне развіццё найсучасных танцавальных напрамкаў ідзе куды больш імкліва, чым у нас. Праграміст Сяргей Паяркоў, які колькі часу танцаваў у мінскім гурце "Каракулі", вярнуўся з Украіны, дзе ўдзельнічаў у тэлешоу "Танцуюць усе!":

— На мой погляд, — кажа кіраўнік Тэатра танца "Каракулі" Вольга Лабоўкіна, — вулічныя танцы развіваюцца нашмат інтэнсіўней. Бо іх мастацтва адкрыта для ўсіх, яны маюць магчымасць сачыць за тым, што робяць іх калегі і "канкурэнты": нешта "падглядаць", пераймаць адно ў аднаго. Гэта, можа, і спантанны, але той неабходны абмен вопытам, якога, бывае, так бракуе іншым "стацыянарным" гуртам. Бо нават на ўзроўні ідэі штосьці можа так захапіць, што ты пачнеш гэта развіваць зусім у іншы бок — у тым кірунку, у якім ты працуеш. І гэта ўжо сам па сабе рух наперад!..

Разуменне "мадэрна" ў найшырокім значэнні слова як "новага мастацтва" — вось тое, чаго, здараецца, бракуе нашым харэаграфам і кіраўнікам гуртоў. А між тым, здаровая прага да навінак даўно ўжо стала не толькі адным з законаў развіцця мастацтва, але і самім паказчыкам узроўню развіцця ў пэўнай галіне. Можна колькі заўгодна кпіць, што, маўляў, на тым жа "Еўрабачанні" даўно ўжо не ацэнваюць ні ўласна спевакоў, ні саму песню, але і яе атачэнне, дзе пастаноўка нумара займае адно з першых месцаў.

— Штогод, дасылаючы ўдзельнікаў на дзіцячае "Еўрабачанне", — кажа прадзюсар тэлеканала "Беларусь 2" Людміла Барадзіна, — мы імкнёмся чымсьці здзівіць спрактыкаваную еўрапейскую публіку. Таму звяртаемся да розных харэографаў, каб штогод быў розны творчы почырк, нейкія навінкі у відовішчным афармленні песні. Бо патрэбны не толькі традыцыйныя прыёмы (без традыцый у мастацтве, як вядома, абысціся немагчыма: гэта адзін з неабходных складнікаў яго развіцця), але і новы погляд, нечаканыя рашэнні — нетрадыцыйны падыход. Часта заўважала, што нейкія харэаграфічныя ідэі даюць штуршок фантазіям і самога дзіцяці. Яно таксама пачынае прапаноўваць нешта новае, гэты творчы імпульс пазітыўна адбіваецца і ўласна на спевах. Аляксандр Мяжэнны, Вольга Шамрова, Алеся Ткачонак, Мікалай Дудчанка — у кожнага свая "разыначка". Памятаю, як уразіла мяне Наталля Чарнюк з Віцебска: да адборачнага тура, які праходзіў у гэтым горадзе, усяго за гадзіну яна паставіла з дзецьмі ажно дзесяці розных гуртоў агульную фінальную кампазіцыю. Увогуле ж, нават па тых песнях, якія штогод вылучаюцца на адбор да "Еўрабачання", заўважна, наколькі больш сур'ёзна пачалі ставіцца да харэаграфіі на месцах. Кожны юны спявак прыязджае з гатовым нумарам, і ўзровень харэаграфіі — штогод расце.

У танцоры я пайду — хай мяне навучаць!

Тым не менш, харэаграфаў у нас катастрафічна не хапае. Рэдка сустрэнеш у Беларусі рэгіён, дзе мясцовыя ўлады ў галіне культуры не скардзіліся б на недахоп, а то і ўвогуле на адсутнасць пастаноўшчыкаў.

Не ўсё ў нас ідэальна і на ўзроўні падрыхтоўкі танцораў. Калі класіка і народны танец маюць добра распрацаваную метадычную глебу, дык як выкладаць найсучасныя кірункі? Тым больш, што з'яўляюцца яны хутка, адзін за адным.

— Павышаць кваліфікацыю даводзіцца пастаянна, — падкрэслівае выпускнік БДУКіМ Аляксандр Зенчанка, які цяпер ўзначальвае мазырскую балет-студыю "Алексіс". — Увесь час у свеце з'яўляецца штосьці новае, і трэба быць у курсе. Стараюся больш ездзіць, выкарыстоўваю кожную магчымасць. Вядома, майстар-класаў і абмену вопытам шмат не бывае. Да нас не прыходзяць, каб вучыцца "для сябе" і надалей танцаваць адно на дыскатэках. Не, яны прагнуць выступаць! Іх прыцягвае сцэна! А для дыскатэкі, маўляў, не мае значэння, ці ўмееш ты танцаваць увогуле. Галоўнае, каб табе было добра, і іншым з табой таксама было б, па меншай меры, няблага. Увогуле ж, праблема невялікіх па колькасці насельніцтва гарадоў у тым, што і танцораў у іх мала, і сцэнічных пляцовак, на якіх можна выступіць, не так многа…

Танцаваць павінны ўсе! Так лічылася здавён, і ўменне танчыць нават прыраўноўвалася да добрых манер і ўмення паводзіць сябе ў грамадстве. Сёння ўсе з настальгіяй узгадваюць, як яшчэ колькі гадоў таму пачатковае харэаграфічнае навучанне існавала ледзь не ў кожнай агульнаадукацыйнай школе. Шмат было і школ з адпаведнымі эстэтычнымі ўхіламі. Цяпер усё гэта — платныя факультатывы, і адоранае дзіця можна проста не заўважыць, калі бацькі не прывядуць яго на заняткі. А між тым, менавіта дзякуючы колішняму "харэаграфічнаму ўхілу", мы маем сёння найталенавітага Віталя Моўчана, які неаднаразова станавіўся лаўрэатам найпрэстыжных конкурсаў, працуе ў Маладзёжным тэатры эстрады і шмат робіць для папулярызацыі эстраднага танцавальнага мастацтва.

— Тым, хто працуе з дзецьмі, — раіць Людміла Барадзіна, — трэба часцей вучыцца… у саміх дзяцей. Памятаю, як на першым "Еўрабачанні", у якім мы ўдзельнічалі, беларускую дэлегацыю запрасілі на вечарыну, і нашы Волечка Сацюк і Яна Гузеева танцавалі там так, што ад іх немагчыма было адарваць вачэй! Усе былі ў захапленні! А яны ж імправізавалі, а не паўтаралі завучаныя рухі. Дзятву трэба вучыць не толькі ўласна танцам, але і імправізацыі. А яшчэ лепш — не перашкаджаць ім выяўляць у танцы, у нязмушаных рухах і пластыцы, сваю індывідуальнасць. Заўважыць гэтую індывідуальнасць — і развіваць надалей, абапіраючыся на сучасную стылістку. Тады ў нас будуць найвысокія дасягненні ва ўсіх сферах, уключаючы найноўшыя эстрадныя танцавальныя кірункі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Трыццаць чатыры працэнты — і ніводнага кліента

Справа не ў зніжцы, або Чаму турысты не карыстаюцца культурнымі перавагамі "Карткі госця Рэспублікі Беларусь"?

Сарыентавацца ў культурнай прасторы пэўнай краіны, у тым ліку выбраць для наведання канкрэтны музей ці мастацкую галерэю, замежнаму турысту даволі складана. Асабліва — не ведаючы чужой мовы, не маючы пад рукой інфармацыі пра час працы аб'ектаў сацыякультурнай сферы пэўнага горада. У такіх сітуацыях на дапамогу вандроўніку прыходзяць "карткі госця" таго або іншага горада, сістэма якіх не першы год актыўна выкарыстоўваецца ў турыстычнай інфраструктуры па ўсім свеце. Да прыкладу, за 24 еўра — менавіта столькі каштуе "Картка госця Таліна" на адны суткі — можна атрымаць не толькі адну бясплатную экскурсію па горадзе, але і вольны ўваход у разнастайныя музеі, на выставачныя пляцоўкі, істотныя зніжкі на наведванне розных, цікавых, у першую чаргу — для турыста, аб'ектаў эстонскай сталіцы. Падобная сістэма працуе ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Берліне, Кракаве... Не з'яўляецца выключэннем і наша краіна. Больш за тое: "Картку госця Рэспублікі Беларусь" можна атрымаць абсалютна бясплатна і, што немалаважна, карыстацца ёй не адзін ці два дні, а два з паловай гады.

Карэспандэнт "К" вырашыў скарыстацца момантам і "выпрабаваць" на сабе калі не ўсе, то хаця б самыя "смачныя" культурныя перавагі гэтага турыстычнага прадукту. Аднак у працэсе даследавання выявіўся і "адваротны бок" ужывання гэткай, падавалася б, істотнай выгоды.

У пошуку крыніцы бонусаў

Праўда, знайсці "Картку госця..." аказалася не так ужо і лёгка. Мяркуйце самі. Згодна з турыстычнай завядзёнкай, па прыездзе ў новы горад у першую чаргу звяртаюцца ў інфармацыйны цэнтр. А таму першым пунктам пошукаў "Карткі госця…" невыпадкова быў абраны Турыстычны інфармацыйны цэнтр Рэспублікі Беларусь, што працуе ў нашай сталіцы. Аднак на ўсе пытанні наконт набыцця "Карткі госця…" супрацоўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме толькі разводзіў рукамі: маўляў, продажам прадукцыі яны не маюць права займацца, а ніякіх картак для бясплатнага распаўсюджвання ім ніхто не прапаноўваў. На жаль, нічым не здолелі дапамагчы карэспандэнту "К" і ў Інфармацыйна-турысцкім цэнтры "Мінск".

Далейшы пошук "Карткі госця..." быў праведзены ў прасторы Інтэрнэту і прывёў, у выніку, на сайт прыватнай кампаніі, якая, як пазней высветлілася, і з'яўляецца афіцыйным аператарам праграмы "Картка госця Рэспублікі Беларусь".

На сённяшні дзень у праграме, што з'яўляецца, па сутнасці, прыкладам дзяржаўна-прыватнага партнёрства, удзельнічае ўжо больш за 200 арганізацый, якія забяспечваюць некалькі соцень кропак прыёму картак унутры краіны. У Беларусі ўдзельнікамі праекта сталі не толькі вядучыя банкі і страхавыя кампаніі, гандлёвыя і медыцынскія цэнтры, гасцініцы, але і ўстановы культуры. Пры гэтым кругласутачная інфармацыйна-дыспетчарская служба неадкладна забяспечвае карыстальнікаў неабходнай даведачнай інфармацыяй аб магчымасцях прымянення карткі.

Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам "К" намеснік міністра спорту і турызму краіны Чэслаў Шульга, праекту "Картка госця Рэспублікі Беларусь" аказваецца ўсебаковая інфармацыйная падтрымка з боку Міністэрства. Акрамя таго, на знакавых, у тым ліку міжнародных, мерапрыемствах з удзелам беларускіх дэлегацый актыўна распаўсюджваюцца гэтыя турыстычныя карткі.

— У развіцці дадзенага праекта мы вельмі зацікаўлены, паколькі праект "Картка госця…" з'яўляецца добрым прыкладам прымянення сусветнага вопыту ў сферы турызму. Сёння ў большасці краін Еўропы выкарыстоўваюцца аналагічныя прадукты. Іншая справа, што ў асобных гарадах — гэта платны і даволі нятанны прадукт, у іншых жа, у тым ліку ў беларускай сталіцы, — ён распаўсюджваецца бясплатна, — падкрэсліў Чэслаў Шульга.

Па словах намесніка міністра спорту і турызму, хацелася б, каб з цягам часу гэты праект стаў больш даступным для любога госця нашай краіны і апраўдваў сваю назву.

Зніжкі на выбар

А што ж установы культуры? Наколькі маштабна яны ўключаны ў праграму "Карткі госця…"? Якія перавагі маюць ад удзелу ў праекце яны самі? А іх кліенты?

Сёння "Картку госця Рэспублікі Беларусь" прымаюць усяго некалькі ўстаноў культуры, інфармацыя пра іх змешчана на сайце Праграмы: гэта Нацыянальны гістарычны музей і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музей гісторыі Мінска і Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура… Пры гэтым варта адзначыць, што з рэгіянальных устаноў культуры ў Праграме прадстаўлены толькі Палац культуры Маладзечна. Па словах Юрыя Цвірко, цяпер вядуцца перамовы аб уключэнні ў яе Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. Па рэгіёнах зрухаў пакуль не назіраецца, хаця той жа транзітны турыст мог бы завітаць у Брэсцкую крэпасць, Палац Радзівілаў у Нясвіжы ці ў Музей Шагала ў Віцебску, як кажуць, па дарозе.

Калі прыватнай ўстанове, каб далучыцца да Праграмы, неабходна заплаціць 150 тысяч беларускіх рублёў, то для ўстаноў культуры гэта абсалютна бясплатна. Пры гэтым кожная мае права вызначаць від паслугі, на які ўстанаўліваецца пэўная зніжка. Гэта можа быць і адзін працэнт (як у Нацыянальнай бібліятэцы — на наведанне агляднай пляцоўкі ў святочныя дні з выкарыстаннем панарамнага бінокля на адну гадзіну), і ажно 34 (як на ўваходны білет у Мемарыяльны музей-майстэрню Заіра Азгура).

Кожная ўстанова культуры, што ўдзельнічае ў праекце, мае права бясплатна размяшчаць інфармацыю на сайце праграмы пра свае мерапрыемствы ды акцыі. І гэты патэнцыял карткі актыўна выкарыстоўваюць, у адрозненне ад іншых, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама — гісторыі Мінска.

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры краіны Святланы Гаўрылавай, уключэнне асобных музеяў у спіс удзельнікаў Праграмы ўзгаднялася з Міністэрствам спорту і турызму. Менавіта гэтым і тлумачыцца фрагментарнасць у выбары ўстаноў. А мо ўсё ж варта падумаць і пра ўключэнне ў пералік рэкамендаваных турыстам, прынамсі, усіх устаноў са статусам "Нацыянальны"? Яны, як правіла, і становяцца "кропкамі адліку" маршрутаў гасцей Беларусі.

А што ж іншыя?

А што мяркуюць наконт праграмы "Картка госця Рэспублікі Беларусь" іншыя айчынныя музеі, якіх у пераліку прапанаваных сёння няма? Калі казаць пра даступнасць "Карткі госця Рэспублікі Беларусь", то, па словах дырэктара сістэмнага аператара праграмы Юрыя Цвірко, сёння ў Рэспубліцы Беларусь у рамках Праграмы выпушчана больш за 500 тысяч картак. Іншая справа, што, паводле задумы стваральнікаў дадзенага праекта, "Картка госця…" з'яўляецца брэндавым, прэстыжным прадуктам, арыентаваным на пэўную аўдыторыю, у першую чаргу — на патэнцыйных замежных інвестараў. Гэтым тлумачыцца і выбар месцаў распаўсюджвання картак: дыпламатычныя прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой, буйныя эканамічныя форумы, міжнародныя фестывалі. Да прыкладу, спецыяльныя выпускі картак былі зроблены да фестываляў "Славянскі базар у Віцебску" і "Залаты шлягер", дзіцячага "Еўрабачання" ў Мінску.

У тым жа Нясвіжскім палацава-паркавым комплексе пра "Картку госця Рэспублікі Беларусь" пачулі ці не ўпершыню. Пры гэтым ідэі выкарыстання гэтага турыстычнага прадукту ў перспектыве не адмовілі, таксама як і шырокае выкарыстанне зніжак. Тым больш, па словах навуковага сакратара ўстановы Аляксандра Храмога, сёлетні турыстычны сезон мае вызначыць, у які час палац наведвае найменшая колькасць турыстаў. У адпаведнасці з гэтым будуць прымацца пэўныя захады па карэкціроўцы турыстычных плыняў, у тым ліку — праз сістэму зніжак. Да прыкладу, пэўныя прэферэнцыі могуць быць зроблены для турыстаў, што наведваюць нясвіжскія архітэктурныя дыяменты кожны панядзелак, а таксама штодня з 9-й да 11-й ранку. Але, пакуль палац не ўведзены ў эксплуатацыю ў поўным аб'ёме, казаць пра гэта зарана.

Пакуль не маюць уяўлення пра "Картку госця..." і ў Мсціслаўскім гісторыка-археалагічным музеі. Па словах навуковага супрацоўніка ўстановы Валянціны Цімашковай, цяпер істотную частку наведвальнікаў музея складаюць турысты са Смаленска. А таму ўвядзенне "Карткі госця…", на яе думку, магло б прывабіць яшчэ больш турыстаў у іх установу. Іншая справа, што кошт уваходнага білета каштуе ўсяго тысячу рублёў, а таму рабіць прэферэнцыю ўладальніку карткі можна, скажам, на фатаграфаванне.

Зацікаўлены ў прыцягненні турыстаў і ў Доме-музеі Марка Шагала ў Віцебску. Як адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам "К" дырэктар установы Людміла Хмяльніцкая, калі дзякуючы "Картцы госця..." пра музей даведаюцца патэнцыйныя турысты з розных краін свету, то, безумоўна, увядзенне такога прадукту — надзвычай актуальнае.

■■■

Відавочна, што кожная ўстанова культуры, і, у прыватнасці, музей, імкнецца прывабіць як мага больш турыстаў, а таму зацікаўлена ў выкарыстанні гасцявой карткі. Не меншую карысць гэты прадукт прыносіць і турыстычным фірмам, якія такім чынам могуць прываблівацьяшчэ больш замежных грамадзян наведаць Беларусь. Вядома ж, сістэма зніжак мае сваю армію прыхільнікаў і сярод саміх турыстаў, для якіх эканоміць пару працэнтаў — не столькі эканамічнае, колькі маральнае задавальненне.

Разам з тым, ужо больш за год "Картку госця Рэспублікі Беларусь" прымае Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура і прапаноўвае, як ужо зазначалася вышэй, уладальнікам гэтага турыстычнага прадукту самую істотную зніжку з усіх устаноў культуры. Аднак, па словах навуковага супрацоўніка ўстановы Алены Крынь, на сённяшні дзень пакуль яшчэ ніводзін уладальнік "Карткі госця…" не скарыстаўся выгодамі музея…

Як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам "К" намеснік міністра культуры Тадэуш Стружэцкі, "Картка госця..." прадукт надзвычай папулярны і пазнавальны ў многіх краінах Еўропы. А таму стаўленне Міністэрства культуры да гэтага прадукту толькі станоўчае, паколькі ён спрыяе аўтарытэту і папулярнасці нашых устаноў культуры за мяжой. Аднак, на думку намесніка міністра, ініцыятыва па далучэнні да Праграмы павінна зыходзіць ад саміх устаноў. У сваю чаргу, Тадэуш Стружэцкі адзначыў, што нейкага адмысловага дазволу ўстановам з боку Міністэрства для далучэння да праграмы "Картка госця Рэспублікі Беларусь" не патрабуецца. Адно трэба толькі пралічыць і ўзгадніць з Міністэрствам памер зніжкі.

Чаму ж вандроўнікі, а гэта, між іншым, — тысячы чалавек, папросту "не даходзяць" да вельмі цікавых, унікальных устаноў культуры? Думаецца, для таго, каб прывабіць наведвальніка, недастаткова толькі падключыцца да той або іншай турыстычнай праграмы. Варта больш актыўна праводзіць сваю маркетынгавую кампанію, заяўляць пра сябе і на міжнародным узроўні, ствараючы для гэтага шматмоўныя старонкі ў Інтэрнэце, актыўней распаўсюджваць інфармацыю пра магчымыя бонусы і прэферэнцыі.

Мо, да Чэмпіянату свету па хакеі, што адбудзецца ў нашай краіне ў 2014 годзе і прыцягне шмат турыстаў, сістэма "Карткі госця Рэспублікі Беларусь" усё ж пачне спрацоўваць на карысць устаноў культуры? І на карысць турыстаў.

Кастусь АНТАНОВІЧ

У кантэксце турыстычнай тэмы

Вялікае падарожжа па Дняпры: "пражэкт" ці ўсё ж — праект?

Турыстычны маршрут па рацэ Днепр з рабочай назвай "З варагаў у грэкі" распрацоўваецца ў Магілёўскай вобласці.

Вядома, што на дадзеным этапе маршрут "асвоены" прыкладна на трэць: невялічкае судна ад Магілёўскага рачнога параходства курсіруе "ў ваколіцах" абласнога цэнтра, але казаць пра даступнасць паслугі для шырокага кола насельніцтва пакуль не выпадае.

— Для запуску праекта яшчэ трэба шмат чаго зрабіць, — распавядае Віктар Сцяпанаў. — Цалкам маршрут існуе, хутчэй, у "пражэктавым" выглядзе. Патрэбна пабудаваць прычалы для суднаў у адпаведных прыпынках, правесці работы па ачыстцы берагоў, пабудаваць, адрамантаваць аб'екты інфраструктуры і г. д. І тут уся справа ўпіраецца ў інвестыцыі...

Так, у рамках Дзяржаўнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2011 — 2015 гады прадугледжана выдзяленне сродкаў на пабудову двух прычалаў. Але далейшае паступленне фінансаў, па словах Віктара Сцяпанава, у бліжэйшы час не чакаецца.

Тым не менш, упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму выпусціла каляровы даведнік з апісаннем маршруту з мэтай прыцягнення ўвагі грамадскасці і патэнцыйных інвестараў да праекта.

Турыстам па водным маршруце, да прыкладу, у вёсцы Баркалабава прапануюць наведаць мясцовы манастыр, куды два гады таму вярнулася цудатворная ікона Баркалабаўскай Божай Маці. У Буйнічах, не кажучы пра наведанне славутага Буйніцкага поля, — пазнаёміцца з традыцыйнымі рамёствамі ў этнаграфічнай вёсцы, стылізаванай пад XIX стагоддзе. Ды яшчэ — пракаціцца на маленькім паравозе і паглядзець на жывёлін у вядомым Магілёўскім заасадзе. Пункт прыпынку "Палыкавіцкая крыніца" мае на ўвазе не толькі наведанне цуд-крыніцы і помніка прыроды рэспубліканскага значэння, але і капліцы Святой вялікапакутніцы Параскевы, заступніцы шлюбу, жанчын і дзяўчат.

— Вядома, што мы будзем імкнуцца ўдзельнічаць у гэтым праекце, — абазначыў пазіцыю ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама ў дачыненні ды новай ініцыятывы яго галоўны спецыяліст Аляксандр Ліпскі. — Нам бачыцца перспектыўным спалучэнне сіл работнікаў культуры і турызму на прыкладзе сумесных мерапрыемстваў.

— Вядома, што назва маршруту гучыць магутна: "З варагаў у грэкі", — падагульняе сказанае Віктар Сцяпанаў, — спадзяёмся, нашу ініцыятыву падтрымаюць іншыя краіны, і захапляльнае падарожжа па Дняпры стане рэальнасцю.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Культура і інвестар: грані сацыяльнага партнёрства

Аддзел культуры Светлагорскага райвыканкама пакуль не мае апякунскага савета ў структуры падпарадкаваных устаноў. І справа тут не ў тым, што мясцовая зямля "неўраджайная" на апекуноў мастацтваў. Да прыкладу, адзін мастацтвазнаўца і сталы аўтар "К" Ізяслаў Катляроў чаго варты. Гэта не без яго чыннага ўдзелу ў горадзе ў свой час адкрылася карцінная галерэя... Але ж гаворка — пра сістэмнасць і планавасць захадаў па сумесным адшукванні рэсурсаў для больш дынамічнага развіцця рэгіянальнай культуры. Не сакрэт, што такой сістэмнасці бракуе на сёння не толькі Светлагоршчыне…

Між тым, сямідзесяцітысячны раённы цэнтр не адчувае недахопу горадаўтваральных прадпрыемстваў. Скажам, мясцовыя нафтавікі і электраэнергетыкі здавён здабываюць працоўную славу не толькі ў раённых, але і ў рэспубліканскіх маштабах. Аднак іхнія інвестыцыі ў родную культуру — эпізадычныя, лакальныя, нядоўгатэрміновыя. Інакш, нагэўна, і быць не можа на першапачатковым этапе ўсталявання дзейсных культурна-эканамічных стасункаў.

Але ўзнікае непазбежнае і заканамернае пытанне: чаму работнікі культуры не здолелі зацікавіць буйных інвестараў цікавымі творчымі праектамі? Начальнік аддзела культуры Светлагорскага райвыканкама Алена Палавец з такой пастаноўкай праблемы катэгарычна не згодная. Праектаў — шмат, проста, цяпер выпрацоўваюцца тэхналогіі будучых планавых узаемакантактаў. Калі казаць больш канкрэтна — прадумваюцца форма і структура каардынацыйнага савета, які возьме на сябе функцыі рэсурснага забеспячэння галіны ў раённым маштабе. Алена Палавец, несумненна, мае рацыю: будучы савет (апякунскі, каардынацыйны, фандрайзінгавы і г. д.) не павінен быць фармальным. Якімі шляхамі дасягаецца мэта? Гэтае пытанне і цікавіла найперш. І не вінаватых я шукаў, а спрабаваў высветліць ступень аднадумства гаспадарнікаў ды работнікаў культуры. Аднадумства не папярова-справаздачнага, а — пацверджанага рэальнымі агульнымі справамі.

Светлагорскі гісторыка-краязнаўчы музей узводзіўся метадам народнай будоўлі, але "выставачны блок" у ім пакуль застаецца "замарожаным".

Светлагоршчына: выпрацоўка тэхналогій узаемакрысных стасункаў

Як станем будаваць "шматпавярховік"?

Пляцоўка для інавацыйнага прарыву

Цяпер — пра творчыя праекты, што могуць зацікавіць патэнцыйнага інвестара... Адной з пляцовак для інавацыйнага прарыву, як падаецца, стаў Светлагорскі гісторыка-краязнаўчы музей. Установа ўнікальная настолькі, наколькі ўнікальны сам горад. Летась Светлагорску споўнілася паўстагоддзя. Музей цалкам адпавядае гарадскому ўзросту: ён узнік колькі гадоў таму і пасля рэканструкцыі дзіцячага садка займеў сучаснае аблічча... Дык вось, установа на сёння яшчэ не выйшла на праектную магутнасць. Справа ў тым, што да ладу тут пакуль не даведзены так званы выставачны блок — левае крыло будынка. Мяркуецца, што ў ім з'явяцца дадатковыя выставачныя памяшканні, канферэнц-зала, пакоі для інтэрактыўных музейных заняткаў, фоталабараторыя. Апошняя — частка вялікага праекта, які мясцовыя музейшчыкі пачалі ўжо рэалізоўваць.

Пачалося ўсё з таго, што светлагорскія калекцыянеры перадалі ў музей унікальныя старыя фотаапараты. Пасля гэтага ўзнікла ідэя платнай фотапаслугі: любы ахвотны можа зафіксаваць сябе для вечнасці ў старадаўнім строі. Праект, які асаблівага інвеставання не патрабуе.

Грошы патрэбны для іншага: выставачны блок застаецца пакуль "замарожаным". Для працягу работ, па папярэдніх прыкідках, спатрэбіцца недзе 4 мільярды рублёў. Спонсары такую суму выдаткаваць не здольныя...

Тым не менш, музей дзейнічае і карыстаецца павышаным попытам сярод наведвальнікаў, у тым ліку — сярод расіян, што адпачываюць у санаторыі, размешчаным на тэрыторыі рёна. За месяц музей прадае білетаў недзе на 4 мільёны рублёў. Прыкладна такія ж грошы ўстанова выдаткоўвае на аплату камуналкі. Не будзем зараз разважаць пра неабходнасць больш рацыянальнага выкарыстання грашовых сум, зробленых установамі ў выніку пазабюджэтнай дзейнасці. Тэма гэтая — бясконцая, а яе абмеркаванне на дадзеным этапе — неканструктыўнае. Таму самы час пагутарыць пра крэатыў, прывабны для інвестара.

Не прасіцелі, а — роўныя сярод роўных

Наступны праект, народжаны ў музеі, менавіта для гэтага і прызначаны. Навуковы супрацоўнік установы Таццяна Ягоранка ўгэўнена, што патэнцыйныя спонсары павінны адчуць: без музея ім не абысціся. Па ініцыятыве намесніка начальніка аддзела культуры Людмілы Грабко музейшчыкі ў свой час наведалі Дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў і набылі матэрыялы, якія распавядаюць пра гісторыю ўсіх светлагорскіх прадпрыемстваў. Лішне казаць, што грошы на гэта выдаткавалі менавіта іх кіраўнікі. У выніку папоўнілася музейныя экспанаты, а кожнае прадпрыемства займела свой прафесійна створаны летапіс. Першы крок да пашырэння кола аднадумцаў быў зроблены.

Крок наступны — аб'яднанне інвестараў вакол агульных спраў. У прымузейным дворыку пачалі ладзіцца вяселлі. Не абышлося і без спонсарскіх уліванняў — невялікіх, але канкрэтных. "Урэшце, мільярды рублёў тут і не патрэбны, — упэўнены ў аддзеле культуры. — Проста, любы бізнес, у тым ліку і дзяржаўны, павінен быць сёння сацыяльна арыентаваным". Менавіта пра сацыяльную значнасць дбалі музейшчыкі, калі вырашылі ў сценах установы ладзіць цырымонію азнаямлення шасцігадовых жыхароў Светлагоршчыны з правамі і абавязкамі грамадзян. А прысутнічаць на ёй будуць ганаровыя грамадзяне горада. Хто ж з патэнцыйных інвестараў адмовіцца падтрымаць такое мерапрыемства?

Сярод вядучых спонсараў мясцовай культуры — ТЭЦ, цэлюлозна-кардонны камбінат, камунальная гаспадарка... Усяго недзе 20 гарадскіх і раённых арганізацый. Якім павінен быць апякунскі савет? Прапаноў — шмат. Неаспрэчна адно: работнікі культуры павінны пачуваць сябе не прасіцелямі, а роўнымі сярод роўных. Зацікаўленыя ж у паслугах культуры гаспадарнікі абавязаны перыядычна збірацца і разам з музейшчыкамі, клубнікамі ды бібліятэкарамі аналізаваць стан спраў агульнай для ўсіх культуры. Урэшце, такую калегіяльнасць персанальнымі тэлефанаваннямі не заменіш. А агульныя пасяджэнні савета прывучаць да самапавагі і дадуць "датыкальнае" адчуванне далучанасці да высакароднай справы...

На выніковай калегіі Міністэрства культуры начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Алег Рыжкоў, кажучы пра аднастайнасць раённых музеяў, у ліку іншых назваў і светлагорскую ўстанову. Пагаджаюся. Ярка выражанай канцэпцыі экспазіцыя яшчэ не мае. Але ж музей — у стадыі свайго станаўлення...

Галерэя спонсараў ад "К"

Пра будучыню Якімавай Слабады

За мінулы год установы культуры Светлагоршчыны зарабілі 681 мільён пазабюджэтных рублёў. З планам справіліся ўсе, у тым ліку і СДК вёскі Якімава Слабада (пакуль яна — не аграгарадок). За кошт чаго? "У тым ліку — і за кошт шчыльнага сацыяльнага партнёрства", — пераканана дырэктар установы Таццяна Вараб'ёва. У яе з кіраўніцтвам Светлагорскай агароднінай фабрыкі кантакты даўнія і шчыльныя. Частка клубнай апаратуры набыта за кошт гэтага прадпрыемства. Няма ў клубнікаў праблем з транспартам, з закупкай падарункаў для конкурсаў і святаў... У намесніка дырэктара фабрыкі па ідэалагічнай рабоце Галіны Зялёнай ёсць яснае бачанне перспектывы такога супрацоўніцтва.

Дырэктар СДК вёскі Якімава Слабада Таццяна Вараб'ёва (злева) і адзін з яе сацыяльных партнёраў — намеснік дырэктара Светлагорскай агароднінай фабрыкі па ідэалагічнай рабоце Галіна Зялёная.

— Сацыяльнае партнёрства — частка дзяржаўнай палітыкі, — кажа яна, — а культура — неад'емны складнік нашай ідэалогіі. Той, хто гэтага не зразумеў, проста адстаў ад часу.

— Тады адкажыце, Галіна Мацвееўна, чаму не ўсе прадпрыемствы раёна актыўна супрацоўнічаюць з клубнымі ўстановамі? Іх на Светлагоршчыне — ледзь не 40, а толькі палова мае падставы сказаць: "У нас ёсць трывалы сацыяльны партнёр". Чаму?

— Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека, ад яго стаўлення да культуры. Перспектыўнае бачанне немагчымае без уліку культурнага ўдасканалення чалавека, якое наўпрост уплывае і на эфектыўнасць вытворчасці.

— І гаворка тут не пра нейкае маштабнае фінансаванне рэгіянальнай культуры. Справа — ва ўзаемаразуменні, у рацыянальным выкарыстанні агульных рэсурсаў на агульную карысць...

— Так, нельга жыць сённяшнім днём... Мы на фабрыцы не проста Год кнігі абвясцілі, але і анкетаванне правялі, каб высветліць, якія мерапрыемствы з гэтай нагоды правесці, куды на экскурсію з'ездзіць, як адпачынак наладзіць... Са сваім СДК мы вельмі шчыльна працуем, бо на нашай тэрыторыі робім агульную справу. Клубныя работнікі ў нас выступаюць, і мы да іх на канцэрты пастаянна ходзім... Па вялікім рахунку, займаючыся выхаваннем нашых работнікаў, іх дзяцей, рыхтуем глебу, так бы мовіць, для з'яўлення ў будучым паўнацэнных спонсараў нацыянальнай культуры.

— Згодны. Але чаму сёння іх мала?

— Калі няма духоўнага разумення праблемы, дык, нагэўна, і эканамічныя рычагі варта выкарыстоўваць. Да прыкладу, падаткі знізіць — і для спонсараў, і для ўстаноў культуры... У адваротным выпадку пра сапраўднае спонсарства вельмі цяжка казаць. Да прыкладу, у горадзе ДК "Энергетык" быў ведамаснай установай, а цяпер ён — на балансе аддзела культуры. А ці можа аддзел такі цяжар пацягнуць?! Ці ж па-дзяржаўнаму гэта? А вось цэлюлозна-кардонны камбінат свае ведамасныя дзіцячыя садкі на бюджэт не перавёў... Каардынаванасці дзеянняў нам бракуе. І справа, урэшце, не ў грошах (наша фабрыка — не з самых багатых), а ў свядомым разуменні таго, што мы пакінем пасля сябе…

Пасля нашай гутаркі я стаў сведкам імправізаванага пасяджэння маленькага апякунскага савета ў складзе Галіны Зялёнай і Таццяны Вараб'ёвай, у ходзе якога была дасягнута дамоўленасць аб узвядзенні агароджы вакол СДК. Але завяршыць гэты раздзел хачу зусім не ідыліччна: у сельскіх клубаў праблем і без агародж — процьма: няма водазабеспячэння, састарэлая музычная апаратура... І кожная з гэтых праблем — кропка прыкладання сіл будучых спонсараў, і ў першую чаргу — гаспадарнікаў дзяржаўных.

ня. А ініцыятыўнасць яго супрацоўнікаў — гарантыя таго, што музей не будзе "мёртвым".

Хто набудзе спортінвентар для Прудка?

Адно з мясцовых меркаванняў наконт будучага апякунскага савета: у такой структуры павінен быць раённы каардынацыйны цэнтр, а на сяле — філіялы. Можна ствараць іх на базе сельскіх саветаў. Сапраўды, каму, як не мясцовым уладам, каардынаваць агульныя намаганні гаспадарнікаў і культработнікаў?

Дырэктар РАМЦ Ірына Ясінецкая (злева) і кіраўнік Парыцкай клубнай установы Ала Харанека ля Дома культуры ў "маленькім Парыжы".

Дырэктар СДК вёскі Прудок Людміла Ходар пераканана, што яе ўстанова павінна рабіць стаўку на моладзь. У вёсцы пражывае ўсяго 280 чалавек, у тым ліку — 10 маладых сямей, тры дзясяткі юнакоў і дзяўчат "дыскатэчнага" ўзросту. А бацькі апошніх у асноўным — работнікі прадпрыемства "Золак-агра"... Людміла — чалавек дасведчаны, працуе ў галіне цягам дваццаці гадоў (дарэчы, вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю маюць 92 працэнты работнікаў культуры Светлагоршчыны). Таму разумее, што без шчыльных стасункаў з мясцовым сельгаспрадпрыемствам — нікуды: выхаванне моладзі — справа агульная, таму і патрэбны тут намаганні ўсіх сельсаветаўскіх "аб'ектаў гаспадарання". А вядучы з іх — "Золак-агра".

Людміла Ходар распавядае, што была намацала ў свой час "масткі" да намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце, а тая сышла з пасады. Цяпер Ходар шукае паразумення з новым намеснікам. А прапанова ў кіраўніка СДК больш чым слушная: ёсць ва ўстанове вольныя памяшканні — былая кантора, — дык чаму б там не ўстанавіць для моладзі спартыўныя трэнажоры? І для выканання плана платных паслуг — палёгка, і для ўмацавання здароўя — стымул добры. Пытанне — у ходзе вырашэння... І зноў хачу сцвердзіць: не прасіцелямі тут клубнікі павінны выглядаць, а раўнацэннымі партнёрамі. Кіраўніка, што СДК бокам мінае, ніяк не назавеш гаспадарнікам новай фармацыі і мэтанакіраванай сацыяльнай арыентаванасці. Кажуць, кіраўнік "Золака..." Юрый Рудніцкі — менавіта з новай генерацыі...

Прудок — звычайная вёска, без аграгарадоцкага сацыяльнага акцэнту. Таму і матэрыяльная база СДК тут крыху "кульгае". Да прыкладу, напрадвесні пачаў крыху падцякаць дах. А будынак — на балансе "Золаку-агра". Але ў Людмілы Ходар сваё стаўленне да выпраўлення сітуацыі: "Самі ўсё адрамантуем бліжэйшым часам — у сельгаспрадпрыемства іншых клопатаў хапае". Усё правільна: партнёрства тым і моцнае, што кожны вызначае для сябе свой прыярытэт, а на выхадзе ўсеагульных намаганняў грамада атрымлівае ўзаемакарысны вынік. Да прыкладу: сучасны спортінвентар для клубнага аб'яднання... Толькі вось хацелася б, каб дзеянні гэтыя ўзгадняліся не похапкам, не на ляту "ў рабочым парадку", а пад эгідай, скажам, уладнага ды планавага сельсаветаўскага кантролю.

Парычы — маленькі Парыж

У гарпасёлку Парычы мясцовы выканаўчы камітэт, па словах дырэктара ГДК Алы Харанека, — асноўны спонсар усіх культурных пачынанняў. Хтосьці запярэчыць: выканкам расходных артыкулаў не мае, пра якое спонсарства ў такім выпадку гаворка можа быць... Не будзем чапляцца да тэрміналогіі. Гарпасялковы выканкам на чале з Галінай Шкрыдзюк каардынуе на сваёй зямлі ўсе гаспадарчыя дзеянні, якія так ці інакш станоўча ўплываюць на стан мясцовай культуры. Па сённяшнім часе — самае што ні ёсць спонсарства. Парычы на Светлагоршчыне называюць маленькім Парыжам не толькі з той нагоды, што гарпасёлак багаты на пераканаўчыя ўзоры архітэктурнай даўніны. Багаты ён яшчэ і традыцыямі. І адна з галоўных — усебаковая падтрымка культуры.

Стараннямі Галіны Шкрыдзюк пры выканкаме створаны і больш за 20 гадоў дзейнічае каардынацыйны савет для ўзгодненасці намаганняў пры падрыхтоўцы і наладжванні ўсіх сацыяльна-культурных мерапрыемстваў. Існуе гадавы план, вызначаны адказныя. "А ўсё таму, што Галіна Аляксандраўна — асоба, прафесіянал", — сцвярджае Ала Харанека. Натуральна, не мог не запытацца: "А што кіраўнікі астатніх сямі сельсаветаў — непрафесіяналы?" Адказ — на паверхні: з-за штодзённай гаспадарчай мітусні яны забыліся, відаць, што на гэтай зямлі інтарэсы ўлады прадстаўляюць, а культура сярод гэтых інтарэсаў не самае апошняе месца займае. Адсюль, напэўна, і ўсе непаразуменні.

СДК вёскі Прудок патрабуе рамонту.

Не, кіраўніцтва Светлагорскага райвыканкама, як пераконвае намеснік старшыні па сацыяльных пытаннях Сяргей Мяркулаў, здолела актывізаваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў сферы культуры, і самадзейныя калектывы ў замежныя "гастролі" за свой кошт не скіроўваюцца. Але... Зноў падкрэслю сваю думку: увагу да культуры адно толькі адміністраваннем не прыцягнеш, і па загадзе спонсар не "народзіцца", а работнік культуры як быў прасіцелем, так ім і застанецца.

На такім падмурку, як падаецца, "шматпавяховік" доўгатэрміновага і раўнапраўнага сацыяльнага партнёрства не ўзвядзеш. Ініцыяваць фінансаванне гэўных праектаў пад "дэвізам" "наце ды адстаньце" можна, а канструктыўнае выніковае сяброўства — не атрымаецца. Значыць, на маю думку, адпаведнай павінна быць і раённая культурная палітыка. Хто не пагаджаецца, няхай аргументавана аспрэчыць.

Самастойнасць — рыса прафесіянала

"Культура павінна штодзённа даказваць, што яна — патрэбная, — даводзіць старшыня Парыцкага гарпасялковага выканкама Галіна Шкрыдзюк. — У нас брэндавыя культурныя мерапрыемствы — норма. І прычына тут адна: мы хочам, каб Парычы былі адметныя. Таму і каманда ў нас баяздольная". Нельга не пагадзіцца! Тэму гэтую пра жыццёвую запатрабаванасць рэгіянальнай культуры "К" пастаянна ўзнімае на сваіх старонках. Як, зрэшты, і агучвае высновы пра тое, што за апошнія гады ў рэспубліканскім маштабе і з дапамогай самых разнастайных дзяржпраграм грашовыя ўліванні ў культуру адбыліся неймаверныя — аналагаў не адшукаць ні за савецкім часам, ні ў іншых краінах постсавецкай прасторы.

І сённяшняя выснова — адназначная: рэгіянальная культура павінна вучыцца самастойнасці. Шлях няпросты. На маю думку, патрэбны тут аптымізацыя пазабюджэтнай дзейнасці, выпрацоўка сапраўды гнуткай падатковай палітыкі ў дачыненні і да патэнцыйных спонсараў, і да канкрэтных устаноў культуры, і больш "агрэсіўная" тактыка абласных, раённых ды сельскіх улад (тут да месца ў чарговы раз згадаць ініцыятыву старшыні Віцебскага аблвыканкама па павышэнні заробкаў бібліятэчным работнікам)... У адваротным выпадку кантраст паміж аграгарадкамі і вёскамі застанецца і надалей не на карысць апошніх...

А калі доўжыць спіс праблем, што датычацца менавіта Парыцкага ДК, дык тут, у першую чаргу, не стае сучаснага асвятлення сцэны. Будзем спадзявацца, што і з гэтай сітуацыі мясцовы каардынацыйны савет Парыцкага гарпасялковага выканкама адшукае годнае выйсце.

Хто каму патрэбны?

На апошняй калегіі Міністэрства культуры начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Алег Рыжкоў агучыў думку на конт стварэння абласнога цэнтралізаванага апякунскага савета, скажам, пры Палацава-паркавым ансамблі Румянцавых. Міністр культуры краіны Павел Латушка выказаў сумневы: маўляў, такая цэнтралізацыя будзе замінаць росту творчай ініцыятывы з месцаў. "А мы конкурс на лепшы культурны праект абвесцім сярод аддзелаў культуры вобласці", — развіў сваю думку Алег Рыжкоў... Пасля камандзіроўкі на Светлагоршчыну я прыйшоў да высновы, што самы час ладзіць аналагічны, але ўжо рэспубліканскі, конкурс і сярод спонсараў. Урэшце, і гэтая "прафесія" патрабуе росту значнасці ды прэстыжнасці...

І яшчэ адна посткамандзіровачная выснова, што датычыцца не толькі Светлагоршчыны. У рэспубліцы ідзе пошук аптымальнай мадэлі будучага эфектыўнага партнёрства са спонсарамі ды інвестарамі. Не стае для гэтага піяру (у Светлагорску работнікі культуры надзвычай актыўна і плённа супрацоўнічаюць з мясцовай тэлестудыяй "Ранак"), бракуе самарэкламы (райвыканкамаўскія сайты збольшага — неінтэрактыўныя, не надта інфарматыўныя)... І самае, бадай, галоўнае — няма пакуль досыць акрэсленага бачання, хто каму патрэбны найперш: гаспадарнікі — культуры ці культура — гаспадарнікам...

Яўген РАГІН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Светлагорскі раён — Мінск
Фота аўтара

Аршаншчына: дзве ўзнагароды

Перамога на "Ружы вятроў..."

"Ружа вятроў у Беларусі" — так называўся Міжнародны конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці, які завяршыўся ў Оршы 18 сакавіка.

У гэтым форуме прынялі ўдзел і юныя таленты Аршанскай дзіцячай школы мастацтваў № 3 баяніст Раман Дзмітрыевіч і народны ансамбль народнай музыкі і песні "Пралескі".

Намінацый і ўдзельнікаў конкурсу было вельмі шмат, і кожны з іх, натуральна, жадаў перамагчы. А навучэнцы нашай школы здолелі заваяваць і прызавыя месцы. У намінацыі "Інструментальная музыка. Ансамблі" калектыў "Пралескі" быў узнагароджаны дыпломам лаўрэата III ступені, а Раман Дзмітрыевіч атрымаў дыплом І ступені.

Усе гэтыя ўзнагароды — заслужаныя. За кожнай з іх стаіць цяжкая праца, вялікая падрыхтоўчая работа і жаданне рухацца наперад, да перамогі.

Наталля ЛАТЫШАВА,
настаўнік Аршанскай ДШМ № 3

Лідчына: сорак зорак з артыстызмам

"...Дождж" змяняўся каруселлю

17 сакавіка ў Лідзе адбыўся XV Адкрыты рэгіянальны фестываль дзіцячай вакальна-эстраднай творчасці "Зорны дождж".

З года ў год расце прэстыж і пашыраецца геаграфія фестывалю: сваё сцэнічнае майстэрства дэманструюць не толькі лідчане, але і юныя салісты з Гродна, Шчучына, Воранава, Дзятлава, Ваўкавыска, Карэлічаў, Іўя, Мастоў, Маладзечна ды Мінска.

Сёлета на сцэне Лідскага палаца культуры аспрэчвалі званне лепшага 40 таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прайшлі папярэднія адборачныя туры. На ўдзел у іх было заяўлена 118 кандыдатур ва ўзросце ад 7 да 18 гадоў. І ўсе канкурсанты прадэманстравалі высокі ўзровень артыстызму і выканальніцкага майстэрства.

Выступленні ацэньвала кампетэнтнае журы, у складзе якога, у прыватнасці, — Вольга Вронская, спявачка, выкладчык па класе эстраднага вакалу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама кампазітар, выканаўца Аляксандр Сухараў.

Гран-пры атрымала Вераніка Пракаповіч — удзельніца Ўзорнай студыі эстраднай песні "Дамінанта" Лідскай гімназіі № 1.

"Зорны дождж" атрымаўся маляўнічым і феерычным, падарыў усім удзельнікам шмат эмоцый і яркіх успамінаў. У перапынках гледачам былі прапанаваны выступленні пераможцаў мінулых гадоў, гульнёвая праграма "Зорная карусель" з удзелам роставых лялек і вясёлых клоўнаў.

Наталля БЫЧКО, культуролаг Лідскага палаца культуры
На здымку: на сцэне фестывалю.

Маладзечаншчына: бібліятэчны вернісаж

Вытанчаныя элегіі

У Маладзечне адкрылася выстаўка карцін Уладзіміра Тамашэвіча. Цягам месяца наведвальнікі Цэнтральнай бібліятэкі змогуць пабачыць 22 жывапісныя творы земляка.

У.Тамашэвіч. "Жнівень".

Выстаўка мае назву "Дарога дадому". Тэматычная сцішанасць, тэхналагічнае эксперыментаванне і жывапісныя экспромты — літаральна ва ўсім адчуваецца стаўленне аўтара да роднай зямлі. Прасякнуты духам радзімы, ён пераносіць свае эмоцыі на палатно. Той свет, які Тамашэвіч запомніў з дзяцінства, цяпер дапамагае яму перадаць глыбока рэалістычныя, блізкія для ўсіх выявы Бацькаўшчыны.

Работы "Чэрвеньскі сад", "Поўдзень", "Снежань", "Перад навальніцай", "Зімой на балоце", "Імгненне" — гэта вытанчаная элегія пра нашу пяшчотную маляўнічую прыроду.

Усе карціны аб'яноўваюць прыглушаныя колеры, нібыта змяшаныя з настальгічным сумам. "Гэта ж не французскі Праванс, каб выкарыстоўваць стракатыя фарбы", — тлумачыць аўтар.

Таццяна КАСЦЯН
Маладзечна

Дзятлаўшчына: кніжныя праекты

Праект, конкурсы, юбілеі

2012-ы бібліятэкі Дзятлаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы сустрэлі з новымі кнігамі.

А сёлета чытачоў чакаюць многія цікавыя мерапрыемствы. Год, як вядома, багаты на юбілеі класікаў нашага слова… Да 65-годдзя Дзятлаўскай ЦРБ прымяркуем Дзень творчай ініцыятывы "Гартаючы памяці старонкі…". У сакавіку наведвальнікі бібліятэк змогуць папрысутнічаць на мерапрыемствах, прысвечаных Дню праваслаўнай, а таксама Тыдню дзіцячай і юнацкай кнігі.

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу распрацаваў праект "Крочым родным краем, фарбы ўсе збіраем". Праект — доўгатэрміновы. Ягоная мэта: абуджэнне цікавасці да гісторыі свайго краю, яго людзей, да беларускай мовы. Складаецца праект з двух этапаў: "Далучыць да роднага слова" і "Пішам гісторыю вёсак, бібліятэк". У выніку будуць створаны зборнікі, памяткі, буклеты, электронныя прэзентацыі.

Сёлета ў раёне аб'яўлены агляд-конкурс выставак "Свет кнігі ў прасторы бібліятэкі". Мэты і задачы яго, сярод іншага, — павышэнне іміджа бібліятэкі як сучаснага інфармацыйнага і культурнага цэнтра, распрацоўка і ўкараненне інавацыйных форм работы.

Святлана СЕРБІН,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Дзятлаўскай ЦРБ



Парадокс, але сёння ў бібліятэках нашай краіны можна сустрэць разнастайныя рарытэтныя кнігі, напісаныя і выдадзеныя стагоддзі таму, у тым ліку — Францыскам Скарынам, але немагчыма знайсці многія выданні на беларускай мове, што пабачылі свет у 1920 — 1930-я. Больш за тое: да апошняга часу не было не толькі саміх кніг, але і інфармацыі пра іх.

Следам за Властам

Адкрыцці па сігнальных экзэмплярах

Каб выправіць сітуацыю, быў падрыхтаваны і выпушчаны другі том "Гісторыі беларускай кнігі". Створаны пры ўдзеле нашага суайчынніка, старшыні Асацыяцыі беларусістаў Санкт-Пецярбурга, загадчыка аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Мікалая Нікалаева, ён пабачыў свет у выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі".

Сярод іншага, том ці не ўпершыню змяшчае грунтоўныя звесткі пра даваенныя кнігі, стварэнне ў 1920-х корпуса нацыянальнай юрыдычнай літаратуры, узоры беларускамоўнай сельскагаспадарчай ды медыцынскай кнігі, ілюстрацыі вокладак і асобных старонак прафесійных выданняў для вайскоўцаў у даваеннай БССР. Прадстаўлены ў заключным томе па гісторыі нашай кнігі і айчынныя выданні ў святле выставак ды сучасных тэхналогій.

Карэспандэнт "К" сустрэўся з Мікалаем НІКАЛАЕВЫМ і задаў яму некалькі пытанняў, непасрэдна звязаных з выхадам другога тома "Гісторыі беларускай кнігі".

— Не без гонару магу зазначыць, што даволі паспяхова завяршыўся маштабны праект, прысвечаны гісторыі беларускай кнігі, — адразу падкрэсліў суразмоўца "К". — Гэта вялікая падзея не толькі для стваральнікаў тома, але і для грамадскасці, бо выданне стала своеасаблівым падсумаваннем усіх здабыткаў айчыннай кніжнай культуры, прытым, што папярэдняе такое даследаванне было зроблена Вацлавам Ластоўскім практычна стагоддзе таму.

— Якія новыя старонкі айчыннай кніжнай культуры раскрывае кніга? Ці варта чытачам чакаць гучных сенсацый і адкрыццяў?

— Пад час працы над выданнем вельмі шмат адкрыццяў было зроблена для мяне самога як для аўтара. Да прыкладу, мала хто ведае, што на Беларусі перад Вялікай Айчыннай уся спецыялізаваная літаратура, неабходная для комплекснай падрыхтоўкі салдат і афіцэраў, выдавалася па-беларуску: і танкісты, і лётчыкі, і пехацінцы карысталіся падручнікамі на роднай мове.

Акрамя таго, даваенных раённых, профільных, заводскіх газет на Беларусі захавалася вельмі мала. Дзякуючы рабоце супрацоўніцы Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Марыі Лукоўскай у кнізе прадстаўлена і падрабязная статыстыка, і ілюстрацыі перыёдыкі першай паловы XX стагоддзя.

— Відавочна, праведзена вялікая праца. Але ці можна сказаць, што праект па даследаванні беларускай кніжнай культуры завершаны?

— Ні ў якім разе! Ды і да кнігі ёсць шэраг заўваг. У прыватнасці, не ўсе тэмы навукова грунтоўна прапрацаваны. Да прыкладу, мала звестак прадстаўлена пра кнігі беларускай эміграцыі, выданні, што пабачылі свет на тэрыторыі колішняй Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Толькі ўскосна закранаецца шэраг юрыдычнай літаратуры, кніг для прамысловасці, выпушчаных у савецкія гады на беларускай мове. Акрамя таго, для многіх можа падацца незвычайным, што вялікае кнігавыданне было наладжана ў свой час у Маскве. Справа ў тым, што пакуль не адбылося ўзбуйненне беларускіх тэрыторый у 1924 годзе, Масква адказвала за "рэпертуар" беларускіх кніг. У архівах захоўваюцца дакументы, што праліваюць святло на тагачасныя тыражы, кошты. У другім томе нашага выдання мы заявілі пра гэтыя факты, аднак іх комплексная прапрацоўка — наперадзе.

Відавочна, мала інфармацыі прадстаўлена нават пра пасляваенны перыяд беларускага кнігавыдання. Па сутнасці, другі том быў створаны ўсяго за год. А таму гэтае выданне варта разглядаць як пачатак больш грунтоўнай працы па беларускім кнігазнаўстве.

К.А.

Пра дачку **каваля**

У музеі "Замкавы комплекс "Мір" — у зале пад назвай "Яўрэйскае гета ў Мірскім замку" — прадстаўлены фотаздымак Соф'і Ермаловіч. Менавіта яна ў гады Вялікай Айчыннай вайны са сваім мужам Ігнатам, рызыкуючы жыццём, лёсам сваіх родных, ратавала ад смерці мірных жыхароў, каму наканавана было загінуць ад куль фашыстаў у гета.

9 лістапада 1941 г., у дзень жудаснай трагедыі, калі амаль 1500 яўрэяў было расстраляна непадалёк ад Мірскага замка, сям'я Ермаловічаў здолела выратаваць ад смерці шэсць чалавек, схаваўшы іх у сваім свірне. Сярод уратаваных была дзяўчына Цыля Капялевіч, бацька якой, Хоня, да вайны працаваў у Міры кавалём. Жывучы па-суседску, Цыля неаднойчы бывала ў хаце Ермаловічаў. Але гэтым разам яна прыйшла не па малако, як раней, да вайны, а — з надзеяй выратавацца. Перачакаўшы колькі дзён у свірне, яўрэі, якіх не знайшлі гітлераўцы (а вобыскі праводзіліся пастаянна), вярнуліся ў гета, што вясной 1942 г. было пераведзена ў Мірскі замак, дзе праіснавала тры з паловай месяцы.

Улетку сярод вязняў была створана група супраціўлення з васьмідзесяці чалавек. Ёю кіраваў Освальд Руфайзен — 20-гадовы яўрэйскі юнак, які выдаў сябе за выхадца з польска-нямецкай сям'і. Ён выдатна валодаў нямецкай мовай, таму быў прыняты ў паліцыю перакладчыкам. Звесткі пра карныя аперацыі Руфайзен выкарыстаў для выратавання яўрэяў, асуджаных на знішчэнне. Менавіта з яго дапамогай быў распрацаваны план уцёкаў. 9 жніўня 1942 г. пакінуць гета здолелі амаль 300 чалавек. Сярод іх была і Цыля. Цягам трох дзён яна блукала па лесе, без вады і ежы, і толькі зразумеўшы, што засталася зусім адна, вырашыла вярнуцца ў Мір па дапамогу. Соф'я і Ігнат Ермаловічы і цяпер не пакінулі яе ў бядзе. Схавалі, накармілі, далі вопратку і абутак. І толькі на досвітку Ігнат правёў Цылю ў лес, дзе пашчасціла знайсці партызанскі атрад братоў Бельскіх…

Пасля Перамогі дзяўчына вярнулася ў Мір і нізка пакланілася тым, хто дапамог ёй выжыць у гады вайны. А пасля выехала ў Паўднёвую Афрыку да сваякоў — шукаць шчаслівай долі. Пазней разам са сваёй сям'ёй пераехала ў Ізраіль, але сувязь з беларусамі падтрымлівала.

Подзвіг жыхароў Міра не застаўся забытым. 26 лістапада 1995 г. Нацыянальны Мемарыял Катастрофы і Гераізму Яд ва-Шэм у Ізраілі прызнаў Ігната і Соф'ю Ермаловічаў Праведнікамі народаў свету. Яны — у ліку 555 беларусаў (даныя па стане на 1 студзеня 2011-га), каму нададзена гэтае званне.

Вольга НАВІЦКАЯ,
загадчык сектара
па навуковай рабоце музея
"Замкавы комплекс "Мір"

Адкуль на Клімавіччыне **латышскае піва?**

Выпадкаў, калі ўраджэнцы Беларусі, а часцей — іх нашчадкі не проста наведваюць сваю Радзіму, але і прывозяць каштоўныя гістарычныя матэрыялы, сёння стала ўжо даволі шмат. У гэтым шэрагу ёсць і тыя, хто паходзіць з Клімавіцкай зямлі.



У прыватнасці, Аляксандр Малышэнка, які сёння жыве ў расійскім Томску, правёў вялікую работу па зборы краязнаўчых матэрыялаў пра вёску Галіч Клімавіцкага раёна і вярнуў з нябыту забытыя імёны сваіх землякоў. Вялікай дапамогай яму ў гэтым сталі… рэвізскія казкі навакольных вёсак за 1811, 1834 і 1858 гады.

Што ж гэта такое — рэвізскія казкі? Гэта спісы насельніцтва Расійскай імперыі XVIII — XIX стст., якія складалі пад час, як вынікае з назвы, рэвізій. У сваю чаргу, апошнія (а іх за ўвесь час існавання падобнай дакументацыі ўсяго было зроблена дзесяць) адбываліся з увядзеннем падушнага падатку. Кожная з "рэвізскіх душ" улічвалася да наступнай рэвізіі, нават у выпадку смерці чалавека.

Аляксандр Максімавіч па выніках сваіх даследаванняў выслаў Клімавіцкаму краязнаўчаму музею рэвізскія казкі. Дзякуючы ім нашы суайчыннікі могуць атрымаць звесткі пра сваіх продкаў.

Да прыкладу, адна з апошніх знаходак выявіла наступны цікавы факт, звязаны з уладальнікамі маёнтка Галіч. Так, у 1811 і 1834 гг. маёнтак належаў штабс-капітану Івану Краеўскаму, у 1858-м перайшоў да паручніка Паўла Калечыцкага, а з 1858 г. яго гаспадаром стаў Вікенцій Каміёнка. Менавіта апошні запрасіў з Латвіі для вядзення гаспадаркі 60 тамтэйшых сем'яў. Латышы пераехалі на новае месца з усёй сваёй маёмасцю. Цягам дзесяцігоддзяў яны захоўвалі свае нацыянальныя традыцыі… Цікава, што ў 1924-м на тэрыторыі раёна ўтварыўся так званы латышскі савет.

У фондах Клімавіцкага краязнаўчага музея захоўваюцца прадметы ткацтва з вёсак Галіч, Фядотава Буда, у матывах арнаменту якіх спалучаюцца мясцовыя і нацыянальныя латышскія асаблівасці. Акрамя таго, латышы славіліся ва ўсёй акрузе і ўменнем варыць піва. Рэдкае вяселле, ды і іншыя сямейныя святы, абыходзілася без гэтага адметнага напою.

Людміла АНДРУШКОВА,
дырэктар Клімавіцкага
краязнаўчага музея
На здымку: узор старонкі
з рэвізскай казкі 1858 г.

Канцэпт Скарынавай графікі

Версіі

Кожны, хто так ці інакш знаёміўся з кнігамі, выдадзенымі нашым славутым Францыскам Скарынам, звяртаў увагу не толькі ўласна на тэкст, але і на аздабленне, у першую чаргу — на разнастайныя гравюры. Некаторыя даследчыкі, сярод якіх — і супрацоўнік Эрмітажа Барыс Сапуноў, выказвалі гіпотэзу аб тым, што аўтарам асобных гравюр у кнігах Скарыны з'яўляецца сам першадрукар.

На жаль, пакуль можна лічыць бясспрэчным толькі яго інтэлектуальнае аўтарства асобных дрэварытаў ды ініцыялаў. Доказам гэтага з'яўляюцца дэталі двух ініцыялаў, сімволіка якіх узыходзіць да "Кнігі літар". Знаёмства тагачасных мастакоў з гэтым фаліянтам цалкам выключана. Напрыклад, толькі вядомы нюрнбергскі гуманіст Піркгеймер, з якім з дзяцінства сябраваў Дзюрар, мог параіць яму выкарыстаць на гравюры "Меланхолія" выяву сімвала органа пачуццяў (цвік). У адрозненне ад Піркгеймера і Скарыны, адукацыйны ўзровень мастакоў (найперш — лінгвістычны) выключаў магчымасць самастойнага вывучэння складаных трактатаў Мірандолы, Агрыпы і Рэйхліна, прысвечаных "Кнізе літар".

Згодна з гэтай кнігай яўрэйскіх гностыкаў, якой захапляліся італьянскія і нямецкія гуманісты, літара "Ш" сімвалізуе зубы, імя Бога (Шадай) і бездакорную артыкуляцыю вымаўляемага Слова. Менавіта выявы дзвюх ніжніх сківіц чэрапа, зубы якіх больш падобныя да расчоскі, змешчаны ў верхняй частцы ініцыяла літары "Амега" над выявай аголенай жанчыны (ісціна). Характэрны сківічны сілуэт загнутых "ручак" правай "расчоскі" цалкам выключае магчымасць памылкі. Парнасць выяў сківіц, падобная да парных адлюстраванняў гарбузоў на ініцыялах літар "Т" і "І", указвае на дваістасць боскай і чалавечай ісціны (так званыя Нябесны Іерусалім і зямныя Афіны, мудрасць Саламона і Арыстоцеля). На два гарады ўказваюць выявы гарбузоў.

У верхняй частцы ініцыяла літары "Мыслеце" з выявай купальшчыцы адлюстраваны старажытнаегіпецкі акрылены сонечны шар з дзвюма змеямі. Згодна з "Кнігай літар", асобныя элементы гэтай выявы сімвалізуюць літары — з іх складаецца імя Бога "Іеве". Літара ж "М" сімвалізуе ваду і таямніцу. Бясформеннасць Абстрактнага Творцы Сусвету атаясамлівалася з бясформеннасцю вады (Мора). Невыпадкова таямнічая Божая ісціна метафарычна параўноўвалася з Вадой, якую цяжка ўтрымліваць паміж пальцамі далоні.

Мікалай ПАЛКОЎНІЧАНКА
Гомель
На ілюстрацыі: літара "М" з кнігі першадрукара.

Гэты мастак — адзін з самых цікавых і дзіўных майстроў беларускай графікі 20 — 30-х гадоў XX ст., які належыў да ліку лідараў пейзажна-бытавога кірунку нароўні, скажам, з Я.Мініным, А.Тычынам, Р.Семашкевічам, Г.Змудзінскім. Ягонае імя — Аркадзь Астаповіч. Ён пражыў кароткае, складанае, але надзвычайна інтэнсіўнае творчае жыццё, пакінуўшы велізарную графічную спадчыну. Толькі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі знаходзіцца больш за 200 ягоных твораў, якія яшчэ ў сярэдзіне 1950-х паступілі ад удавы Аркадзя Антонавіча — Ніны Рыгораўны Астаповіч-Якубовіч...

Мір і вайна мастака Аркадзя Астаповіча

Аркадзь Астаповіч.

Кропля крыві на аркушы белым

Але амаль 20 гадоў, з 1940-га — часу ўдзелу мастака ў чэрвеньскай Дэкаднай мастацкай выстаўцы БССР у Маскве — і да 1960-га — да яго першай пасмяротнай выстаўкі ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР — мала хто з гледачоў чуў пра гэтага графіка, бо практычна нічога ў СМІ, звязанага з ягоным іменем, не з'яўлялася. І толькі ў 1960 годзе дзякуючы асабістай ініцыятыве Алены Аладавай ды яе маскоўскіх сяброў у музеі адбылася выстаўка твораў А.Астаповіча. Тады ж былі надрукаваны і некалькі невялічкіх артыкулаў у газеце "Літаратура і мастацтва" і ў часопісе "Беларусь" аўтараў П.Герасімовіча і Л.Ніканорава (чытай: Л.Дробава). Потым — зноў маўчанне. Праўда, на пачатку 70-х я сёе-тое ведаў пра жыццё мастака з вусных успамінаў яго сяброў А.Тычыны, П.Герасімовіча і Я.Красоўскага, і нават меў задумку напісаць у "ЛіМ", тым больш, што яго спадчына ў нашым музеі была вельмі багатая, але нешта не атрымалася. Да таго ж, у гэты час выйшла манаграфія В.Шматава "Беларуская графіка", дзе аўтар, акрамя артыкулаў пра іншых айчынных графікаў даваеннага перыяду, распавёў таксама і пра Астаповіча.

Нарэшце, у 1989 — 1990-м у Мінску і Віцебску адбылася яшчэ адна выстаўка твораў мастака — разам з сястрой З.Астаповіч-Бачаровай. А праз шэсць гадоў выйшаў у свет цудоўна ілюстраваны альбом-каталог выстаўкі абодвух мастакоў, падрыхтаваны дацэнтам БДУ Аленай Смірновай (унучкай З.А. Астаповіч-Бачаровай) і супрацоўнікамі музея Надзеяй Усавай ды Валянцінай Вайцэхоўскай (да 100-годдзя А.Астаповіча). Да сённяшняга дня гэты каталог застаецца самай грунтоўнай крыніцай для вывучэння жыцця і творчасці нашых выдатных землякоў — Аркадзя і Зінаіды Астаповічаў. Але зараз я распавяду толькі пра Аркадзя Антонавіча, які па-сапраўднаму з'яўляецца класікам нашага мастацтва, адным з тых, хто заклаў вельмі моцны фундамент у даваенны пласт беларускай нацыянальнай графікі.

…Так здарылася, што Аркадзь Астаповіч, нарадзіўшыся ў Мінску, пайшоў адсюль і на сваю смерць. Сыходзіў ён з горада ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны: 45-гадовы старшы лейтэнант запасу пайшоў на фронт дабраахвотнікам. За пару дзён да ўваходжання немцаў у Мінск ён пакінуў жонку і двух сыноў у сям'і свайго былога вучня ў вёсцы Каралёў Стан. Потым прайшоў пешкі каля 300 кіламетраў на ўсход і злучыўся з ацалелымі часцямі Чырвонай Арміі. Але толькі тры месяцы паспеў праваяваць у 111-м асобным батальёне 6-й стралковай дывізіі. 23 верасня 1941 года, у дзень нараджэння сваёй сястры, мастак загінуў смерцю храбрых у кровапраліт-ной бітве ля вёскі Рухава-Буды пад горадам Арлом. Сястра мастака Зінаіда Антонаўна атрымала пахавальную за подпісамі камандзіра батальёна, ваеннага камісара Шалудзько і начальніка штаба Шулякоўскага. Да сённяшняга дня так і не вядомае месца яго пахавання…

А вось дакладнае месца нараджэння творцы (і яго сястры таксама) вядомае: гэта дом на рагу вуліц Магазінная (цяпер — вуліца Кірава) і Каломенская (сёння вуліца Свярдлова). Бацька — Антон Антонавіч, калежскі сакратар, потым — тытулярны саветнік, настаўнічаў у Мінскім чатырохкласным вучылішчы; маці — Марыя Ільінічна — займалася хатняй гаспадаркай і была таленавітай рукадзельніцай. Дарэчы, дзед будучага мастака лічыўся "майстрам карэтных спраў" і добра граў на скрыпцы. У 1890 годзе, калі Аркашу споўнілася чатыры гадкі, сям'я пакінула Мінск. Спачатку атабарыліся ў Рэчыцы (тады — Мінская губерня), а ў 1906-м — пераехалі ў Гродна, дзе і пражылі да пачатку Першай сусветнай вайны. Як лічыла Зінаіда Антонаўна, "гродзенскі перыяд" быў для ейнага брата "адным з самых шчаслівых і самых дабратворных у жыцці".

Пачатковую адукацыю Аркадзь атрымаў у Гродзенскай мужчынскай гімназіі, дзе лічыўся "першым вучнем", скончыўшы яе ў 1914 годзе з залатым медалём. Захаваўся альбом малюнкаў алоўкам, які ён вёў у гэтай гімназіі ў 1913-м. Тады яму было ўсяго сямнаццаць. Зразумела, за плячыма ніякага досведу, але па гэтых малюнках можна зрабіць выснову, што выкладанне выяўленчага мастацтва тут вялося на вельмі высокім узроўні. На жаль, імёнаў выкладчыкаў я не ведаю, але па вучнёўскіх накідах Астаповіча можна лічыць, што педагогі (ці педагог) былі добрыя. Прынамсі, такія малюнкі, як "Вуліца ў Гродне", "Гарадскі пейзаж", "Від з акна", "Вясковы краявід", "Дрэвы пад націскам моцнага ветру", "Тэлеграфныя слупы на галоўнай вуліцы губернскага горада", сёння цалкам маглі б экспанавацца на любой нашай рэспубліканскай выстаўцы графікі, бо выкананы яны па-сапраўднаму артыстычна, з эфектнай растушоўкай, з віртуознай штрыхоўкай. Ды і кампазіцыя ў гэтых аркушах — даволі выразная.

Пасля смерці таты ў лютым 1914 г. сям'я пераехала да сваякоў у Пецярбург, які хутка, на пачатку вайны, стаў Петраградам. Аркадзь і Зіна пасяліліся ў кватэры № 29 на Кацярынінскім канале, дом № 12. І неўзабаве Аркадзь стаў студэнтам Політэхнічнага інстытута на аддзяленні карабслебудавання. Адначасова ён пачаў займацца ў Рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастацтваў, дырэктарам якой быў колішні педагог Шагала — Мікалай Рэрых. А непасрэднымі настаўнікамі ў Аркадзя былі Іван Білібін — цудоўны ілюстратар і сцэнограф, "чалавек вялікай культуры, сімпатычны і дзелавіты" — ды Альфрэд Эберлінг, вучань Рэпіна, жывапісец і графік, у будучым — адзін са стваральнікаў ленінградскай школы жывапісу. Яшчэ быў настаўнік Павел Навумаў, таксама цікавы мастак, дарэчы, сябра Ясеніна, з якім ён у 1916 годзе служыў санітарам у лазарэце Феадораўскага гарадка ў Царскім Сяле. Як успамінала Зінаіда Антонаўна, маючы на ўвазе "петраградскі перыяд" жыцця, "…гэта быў светлы час, калі мы былі маладыя, поўныя надзей і энергіі", перыяд захаплення тагачаснымі мастакамі "Мира искусств", класікамі рускай літаратуры, Сярэбраным векам, французскімі паэтамі-сімвалістамі: "Брат быў вельмі эрудзіраваным чалавекам і ў галіне выяўленчага мастацтва, і ў галіне музыкі, літаратуры, паэзіі. З ім было цікава, стасункі з ім узбагачалі. З мастакоў любіў Левітана і вельмі многіх іншых старых і новых майстроў. З паэтаў — Пушкіна, Цютчава, Ясеніна, Верхарна…"

Але доўга займацца Астаповічу ў школе не давялося. Праз паўтара года ён быў мабілізаваны ў армію для паскоранага праходжання курса інжынераў-сапёраў, так што нейкі час давялося паслужыць у сапёрным батальёне. А тут грымнула рэвалюцыя, і Астаповіч перайшоў на бок бальшавікоў, апынуўшыся ў часцях Чырвонай Арміі ў Харкаве. Так атрымалася, што ў час воінскай павіннасці малады ваенны інжынер змог у гэтым горадзе, тагачаснай сталіцы Украіны, займацца і ў мастацкай студыі. Невядома, у каго тут мастак вучыўся. Але захаваўся адзін твор, падораны Астаповічу ад нейкага педагога студыі (школы), у якім ёсць такі надпіс ад 14 красавіка 1922 года: "Добраму і слаўнаму вучню майму А.А. Астаповічу на ўспамін аб харкаўскіх днях, якія праведзены атрыманыя ў Петраградскім політэхнічным інстытуце!). Тут жа, у Навасёлках, у 1924-м бярэ шлюб са сваёй стрыечнай сястрой — дачкой мясцовага святара і вясковай настаўніцай Нінай Рыгораўнай Якубовіч, якая была старэйшая за мастака на сем гадоў (памерла ў 1963-м). Але ўсё здарылася па вялікім каханні, вынікам якога сталі сыны Арсен і Валянцін, што, на жаль, не дажылі да сённяшняга дня.

А.Астаповіч. "Восень". 1915 г.

"Навасёлкаўскі перыяд" жыцця Астаповіча можна па праве лічыць найлепшым у ягонай творчасці, бо менавіта ў 20-я гады ён стаў тым пейзажыстам-наватарам, што назаўсёды павінен увайсці ў першую пяцёрку лепшых даваенных графікаў Беларусі. Хаця і пазней, у 30-я, ён стварыў у галіне пейзажнага жанру некалькі акварэльных серый лірыка-паэтычнага характару. Але пра гэта ніжэй. Так, у Навасёлках у творчасці майстра з'яўляецца тая знакамітая Астаповічава чорная акварэль-туш, з якой заўсёды асацыіруецца імя аўтара. "Мой жыццёвы шлях канчаткова вызначыўся, і далейшыя змены ў ім могуць адбыцца толькі пад уплывам стыхійных сіл…", — піша ён да сястры 9 верасня 1924 г. "Стыхійныя сілы" з'явяцца трошкі пазней, калі ён пераедзе ў Мінск…

Упершыню творы мастака экспанаваліся на Першай Усебеларускай мастацкай выстаўцы напрыканцы 1925-га, якая адбылася ў Мінскім камуністычным універсітэце па Універсітэцкай вуліцы, 27. Па сутнасці, гэта быў першы буйны агляд усіх творчых сіл, што тады працавалі ў Беларусі, і, як пісала прэса, "…момант першага знаёмства мастакоў і збліжэння паміж сабой і першага з імі знаёмства працоўных мас Савецкай Беларусі". У экспазіцыі вялікае месца заняла графіка. З 1115 твораў амаль палова была выканана ў розных графічных тэхніках: ад малюнкаў тушшу А.Астаповіча, В.Дваракоўскага і Г.Змудзінскага да лінарытаў А.Тычыны, А.Вало і ксілаграфій М.Аксельрода і П.Гуткоўскага. З той пары Астаповіч, уключна па 1932-і, прымаў удзел і ў наступных чатырох Усебеларускіх выстаўках...

(Заканчэнне будзе.)

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 24 сакавіка — да 31 сакавіка

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:
- **"Зачараванне Усходу"** (выстаўка твораў кітайскага жывапісца Сяо Юя).
- **"Мастацтва пачынаецца з..."** (беларускі жывапіс XX ст. з прыватных калекцый).
- Партрэт **Войцэха Пуслоўскага** пэндзля **Валенція Ваньковіча**.
- **Слуцкія паясы** з фонду Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.
- **"Кветкі раю"** (малюнкі на шкле і маляваныя дываны).

Музейны праект "Нашы калекцыі":
- **"Іван Шышкін: жывапіс і графіка"**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.
- Пастаянная экспазіцыя.
- **"Цярноўнік крэсаў"**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка **"Кветкі Расіі"** Паўлавапасадскай хустачнай мануфактуры.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- Выстаўка рускага жанравага жывапісу XIX — пачатку XX стст.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"З крыніц адвечнай прыгажосці"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"**.
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
- **Да 25 —** фотавыстаўка **"100 х Францыя"** (французская фатаграфія ад вытокаў да нашых дзён).
- **3 27 — "Герой Смаленска і Барадзіно"** (асабістыя рэчы Івана Паскевіча).

Дом-музей I З'езда РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Выстаўка **жывых трапічных матылькоў**.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мінулае"** (аўтарскія работы В.Прыешкіна).
- **"Парад лялек"**.
- **"Нам засталася спадчына"** (макеты і дыпломныя работы выпускнікоў гімназіі № 75).
- **"Ілюстрацыі да гісторыі беларускай"** (фотавандроўка В.Раковіча).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.
- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Выстаўка **"Слова — радасць, слова — чары"**, прымеркаваная да Сусветнага дня паэзіі.
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.
- Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы"**.
- **"Над Віллёй-ракой... (Адкрый Літву)"** (фотавыстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы).
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Інтэрактыўная гульня **"У пошуках Папараць-кветкі"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- **"Песня Дзвіны Тараса Хадкевіча"** (кнігі).
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"**.
- **"Тэатральныя лялькі — госці музея"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Партызанскі лагер"**.
- **"Пасляваенная вясна"** (адзенне і аксесуары 40 — 60-х гг. XX ст.).

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Калекцыйныя шахматы Р.Пашкова"** (выстаўка арыгінальных шахматных фігур з батальнымі сцэнамі розных гістарычных эпох).
- Арт-праект **"Буслы"** (сумесна з Веткаўскім музеем народнай творчасці імя Ф.Р. Шклярава).
- **"Паланэзы на вяртанне"** (прысвячаецца кампазітару і палітычнаму дзеячу М.Агінскаму)
- **"Гомель старадаўні — горад рамесны"** (да 870-годдзя першай згадкі Гомеля ў пісьмовых крыніцах).
- **"Вясновы настрой"** (работы мастачкі Таццяны Кулецкай).
- **"4 у 1"** (выстаўка твораў сучасных беларускіх скульптараў).

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокальны паверх паўднёвай галерэі палаца).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- Работы скульптара Э.Астаф'ева (у рамках праекта **"Класікі беларускага мастацтва XX ст."**).

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
- Пакой крывых люстэркаў (пакой смеху).
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Афганистан. И снова память говорит..."**.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ГАЛЕРЭІ *

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

Выстаўкі:
- **Да 25** — Рэспубліканская мастацкая выстаўка каліграфіі і шрыфта **"Літ-арт"**.
- **Да 25** — Рэспубліканская мастацкая выстаўка **"Маладзёжная-2012"**.
- **З 30** — духоўна-асветніцкая выстаўка-кірмаш **"Вербны кірмаш"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.
- **"Повязь"** (габелены Людмілы Пятруль і яе вучняў).

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

НА II КВАРТАЛ 2012 ГОДА

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

ТЭАТРЫ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **24** — Грузінскі балет і Ніна Ананіяшвілі (вечар аднаактовага балета).
- **25** — **"Мадам Батэрфляй"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Пучыні.
- **28** — **"Музычная табакерка"** (музычныя вечары ў Вялікім).
- **30,31** — **"Жызэль, або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А.Адана.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **25, 27, 28** — **"Ліфт"** (хроніка аднаго злачынства) Ю.Чарняўскай.
- **29** — **"Містэр Розыгрыш"** С.Кандрашова.
- **30** — **"Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
- **31** — **"Шчаслівы муж"** (камедыя) Ф.Аляхновіча.

Спектаклі для дзяцей
- **27, 28** — **"Воўк-мараплавец"** (музычная казка) С.Казлова.
- **29** — **"Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Я.Конева.
- **30, 31** — **"Дамавічкі"** (музычная казка) Я.Конева.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **25, 26** — **"Граф Люксембург"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара.
- **28** — **"Душа мая, Італія"** (канцэрт Альмы Манэра — Італія; дырыжор — А.Галанаў).
- **29** — **"Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **24** — **"Ямелева шчасце"** (казка ў 2-х дзеях па матывах рускіх народных казак).
- **25, 27** — **"Асцярожна, Соня!"** (казка) А.Усачова.
- **28** — **"Бука"** (казка-гульня ў 2-х дзеях) М.Супоніна.
- **29,30** — **"Чароўная зброя Кендзо"** (казка-гульня ў 2-х дзеях) М.Супоніна.
- **31** — **"Піліпка і ведзьма"** (казка ў адной дзеі) С.Кавалёва.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя: Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E MAIL: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2012.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 8001
Падпісана ў свет 22.03.2012 у 18.30
Замова 1260
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная).
Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35